Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

Літаратура і мастацтва

ISSN 0024-4686

№ 43 (4946) 27 кастрычніка 2017 г.

Па мясцінах слаўнай мінуўшчыны 4


Публіцыстыка: журналістыка ці літаратура? 5

Памяць, якая баліць 6

Адкрытасць у дзеях 12-13


Улавіць думку 16

Фота Кастуся Дробава.

Мікалай Чаргінец падчас аўтограф-сесіі.

На хвалі юбілею

Пісьменнікі сярод чытачоў у чарзе па аўтографы?

Так бывае, калі кнігі падпісвае сам старшыня творчай арганізацыі, ды яшчэ з нагоды ўласнага свята: юбілей Мікалая Чаргінца сабраў напрыканцы мінулага тыдня не толькі творцаў (у розных мастацтвах), але і грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў. Віншаванні пачаліся задоўга да творчай вечарыны ў канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі фактычна падчас аўтограф-сесіі. Паглыбленне ў творчасць старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі працягвалася падчас прагляду дакументальнага фільма, у якім падрабязна распавядалася пра пройдзены шлях, станаўленне асобы, раскрывалася сутнасць чалавечых поглядаў і творчыя прыярытэты.

Працяг на стар. 2 ►

ВЯРТАННЕ «СПАРТАКА»

Легендарны балет аднаўляецца ў Вялікім тэатры Беларусі дзякуючы Валянціну Елізар'еву

Прыйшоў майстар — і закруцілася. Рэпетыцыі — гадзінамі. Адпрацоўка рухаў — да дасканаласці. Адчуванне характару — на максімальным паглыбленні…

Народны артыст Беларусі і СССР Валянцін Елізар'еў рыхтуецца адзначыць свой юбілей у тэатры, у які прыйшоў зусім юным па размеркаванні. Гэта цяпер мы ведаем, што сваю славу балетнай краіны Беларусь здабыла дзякуючы яму. «Мяне нават у сусветных энцыклапедыях называюць беларускім харэографам», — кажа Елізар'еў, пры гэтым адзначае, што нарадзіўся ў Баку, адукацыю атрымліваў у Ленінградскім акадэмічным харэаграфічным вучылішчы імя А. Ваганавай і ў Ленінградскай кансерваторыі імя М. Рымскага-Корсакава.

Падчас рэпетыцый з Валянцінам Елізар'евым.

Але Мінск стаў лёсам, а на лёс Елізар'еў не скардзіцца: спрыяў у розныя перыяды жыцця. Перыяд яго актыўнай працы ў тэатры можна занесці ў падручнікі па беларускім мастацтве: спектаклі з вельмі асаблівай пластычнай мовай, праз якую ствараліся кранальныя гісторыі людзей і нават маштабныя палотны, дзе адлюстроўвалася гісторыя народаў ці зрухі эпох. Была эмацыянальная «Кармэн-сюіта» (муз. Ж. Бізэ ў апрацоўцы Р. Шчадрына) і эпічны «Ціль Уленшпігель» (Я. Глебаў), «Стварэнне сусвету» (А. Пятроў), якое ледзь не знялі за «боскасць» тэмы, а нябёсы ўсё расставілі па месцах, і паспяховы балет ніхто не асмеліўся крануць, моцнымі і вельмі экспрэсіўнымі атрымаліся балеты «Карміна Бурана» (К. Орф) і «Балеро» (М. Равэль), ды і ў класіцы Валянцін Елізар'еў не ішоў па зададзеным шляху, а знайшоў сваю выразную мову, напрыклад, у балеце «Шчаўкунок» (П. Чайкоўскі). І ён мог узяцца за тэму нацыянальнай гісторыі ў балеце «Страсці» (А. Мдзівані), адзначаным прэстыжнай прэміяй «Бенуа дэ ля Данс».

Фота Кастуся Дробава.

Адной з адметных пастановак Елізар'ева быў балет «Спартак», створаны на музыку Арама Хачатурана. Дарэчы, кампазітар сам пагадзіўся зрабіць апошнюю ў сваім жыцці рэдакцыю гэтага балета. Магчыма, пачуў ад балетмайстра такое разуменне гэтага твора, што не змог адмовіць… Балет, які з'явіўся ў 1980 годзе, меў трыумф. І не толькі ў Беларусі.

Працяг на стар. 3 ►

Пункцірам

✔ Некалькі соцень работ паступіла на конкурс па стварэнні талісмана Еўрагульняў-2019. Пра гэта паведаміў міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА на тэму «Беларусь рыхтуецца да Еўрагульняў-2019». У СМІ і сацыяльных сетках была праведзена маштабная інфармацыйная кампанія, дзе тлумачылася палажэнне аб конкурсе, умовы, канцэпцыя. «Малюнкаў пакуль некалькі соцень. Але эскізы, на мой погляд, не адлюстроўваюць у поўнай меры ідэі, закладзеныя ў палажэнні», — адзначыў Аляксандр Карлюкевіч. Большасць аўтараў работ — школьнікі і вучні ўстаноў з мастацкім ухілам. Эскізы дастойныя з пункту гледжання тэхнікі выканання, але хацелася б больш крэатыву, падкрэсліў міністр.

✔ Старт традыцыі правядзення абменных Дзён культуры паміж Беларуссю і ААЭ дадзены 23 кастрычніка ў Мінску, падкрэсліў міністр культуры Юрый Бондар падчас урачыстага адкрыцця Дзён культуры Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у Беларусі. Адметна, што мерапрыемствы ладзяцца ў межах святкавання 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносін паміж краінамі, нагадаў Юрый Бондар. Паводле міністра, узаемадзеянне з ААЭ ў Беларусі разглядаюць як адзін з прыярытэтных кірункаў знешняй палітыкі. Нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, дзве краіны знаходзяць новыя напрамкі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

✔ Слова Скарыны на сербскай мове гучала на кніжнай выстаўцы ў Бялградзе, паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі Беларусі. Па 29 кастрычніка ў сталіцы Сербіі праходзіць 62-я Бялградская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, дзе адбылася прэзентацыя беларускага стэнда. Прадстаўлена літаратура рознай тэматыкі: мастацкая, краязнаўчая, дзіцячая, вучэбная. Экспануюцца кнігі, прысвечаныя Францыску Скарыну і 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Госці выстаўкі могуць убачыць кнігу «Сусветная спадчына Францыска Скарыны», выдадзеную на беларускай, рускай і англійскай мовах выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі».

✔ Выданні да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання прэзентуюць на VII Міжнароднай кніжнай выстаўцы ў сталіцы Таджыкістана, паведамілі ў Міністэрстве інфармацыі. Дэлегацыя беларускіх выдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў прадставіла на выстаўцы, якая праходзіць гэтымі днямі, выданні 2016—2017 гадоў выпуску. На стэндзе Беларусі госці знаёмяцца з кнігамі дзяржаўных выдавецтваў «Мастацкая літаратура», «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі», «Беларусь», Выдавецкі дом «Звязда», «Народная асвета». Асобная калекцыя ўключае выданні, прысвечаныя Францыску Скарыну і юбілею беларускага кнігадрукавання.

✔ Школьнікаў 10—15 гадоў на асенніх канікулах прыме містычна-гістарычны лагер «Дзікае паляванне» па матывах твораў беларускіх пісьменнікаў. Канцэпцыя і ідэя лагера вытрымана ў стылістыцы твораў Уладзіміра Караткевіча і Яна Баршчэўскага. Месцам дзеяння абраная база лагера «Легенда» ў аўтэнтычным і маляўнічым кутку Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Гэта сядзіба «Запаведны востраў», якая стагоддзі таму была стаянкай крывічоў. Арганізатары падрыхтавалі рэканструкцыю знакамітых твораў «Дзікае паляванне караля Стаха» і «Шляхціч Завальня». Падлеткі далучацца да беларускіх звычаяў, паўдзельнічаюць у прыгодніцкіх выпрабаваннях. Будзе прапанавана і падарожжа ў Полацк.

У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

На хвалі юбілею

Юбіляр заняў месца на сцэне, адкуль зручна было ўглядацца ў залу ў пошуку вачэй таго ці іншага чалавека, з якім звёў лёс. Такіх было фактычна поўная зала. Шаноўныя госці выходзілі да мікрафона, каб выказаць віншаванні асабіста: намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль Жарко, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, міністр інфармацыі Алесь Карлюкевіч, намеснік міністра культуры Ірына Дрыга, старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр Радзькоў, протаіерэй Фёдар Поўны, настаяцель Усіхсвяцкага прыхода г. Мінска, прадстаўнікі Акадэміі навук Беларусі, паэт Мікола Мятліцкі… Госці прыходзілі з падарункамі, нават з такімі, што наогул толькі для выбраных і праверaных: ад былых калег — пісталет Макарава, баявая зброя, таму што Мікалай Чаргінец лічыць, што і на творчай працы працягвае служыць радзіме. І ў гэтым адзін з яго асабістых талентаў: бачыць больш, чым звычайныя людзі. Ёсць у гэтым водгук і службы ў органах правапарадку, і ў шэрагах воінаў-інтэрнацыяналістаў у Афганістане, і выканання задач кіраўніцтва дзяржавы падчас працы ў парламенце ды Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Адпаведна, і ўзнагароды: ордэны СССР і Беларусі, больш за пяць дзясяткаў медалёў розных краін. Чалавек рознабаковы, кажуць у такіх выпадках. І літаратар, з творчасцю якога звязваюць такі жанр, як міліцэйскі дэтэктыў. Цікавы, між іншым, не толькі ў нас: творы аўтара перакладзены на шмат моў, вось і на юбілейнай вечарыне прысутнічалі некаторыя перакладчыкі, як Жан Гараньен з Францыі.

Ды не ўсе даехалі, напрыклад, папулярны артыст Андрэй Разін даслаў віншаванне з выбачэннем, што захрас у дарозе. Затое даехаў гурт «СССР»: суровыя хлопцы ў камуфляжы спявалі песні настальгічнага гучання для юбіляра, выціскаючы скупую мужчынскую слязу. Узняла настрой аптымістычнымі словамі пра жаданне жыць народная артыстка Беларусі Ядвіга Паплаўская. Кампазітар Алег Елісеенкаў узгадаў, як падчас гутарак за сямейным сталом у Чаргінцоў «зацвярджаў» песні, што пісаліся для фільмаў, знятых паводле кніг пісьменніка. Эдуард Ханок акрамя таго, што спяваў сам свае шлягеры, прадэманстраваў сваю тэорыю ў «хваляграме», паабяцаўшы неўзабаве сенсацыю. Але лепшым сведчаннем доўгай хвалі ў музыцы сталі песні славутых «Песняроў», іх выканалі музыканты, што выступаюць пад кіраўніцтвам Леаніда Барткевіча. Добрыя песні. Далі магчымасць панастальгіраваць юбіляру і большасці гасцей, што ўласна памятаюць выступленні тых, колішніх «Песняроў» у зорным складзе. Памяць наогул — адзін з самых дзейсных інструментаў, праз які грамадству прапануюць ідэі: праверaныя часам, з праверaнымі людзьмі. Творчая вечарына Мікалая Чаргінца прадэманстравала: ён у форме, «у страі», «гатовы да працы і абароны» ў свае 80 гадоў.

Марыя АСІПЕНКА

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

З міжнароднай адзнакай

вярнулася з Масквы беларуская пісьменніца

Кніга Ніны Каленчыкавай (Русаковіч) «Я снова чью-то песню слышу» (С. Ясенін і бардаўская песня), якая ўяўляе сабой літаратуразнаўчае даследаванне, адзначана Міжнароднай літаратурнай прэміяй імя Сяргея Ясеніна «О Русь, взмахни крылами» Саюза пісьменнікаў Расіі. Узнагароджанне адбылося ў Маскве ў Цэнтральным Доме літаратара.

Дарэчы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ніна Васільеўна Каленчыкава — лаўрэат Міжнароднай Пушкінскай прэміі 2004 года.

ЛіМ КАЛЯНДАР

28 кастрычніка 95 гадоў спаўняецца Міхасю Даніленку, беларускаму празаіку, паэту, публіцысту.

29 кастрычніка — 110 гадоў з дня нараджэння Ларысы Аляксеевай (1907 — 1998), беларускай спявачкі, народнай артысткі БССР.

30 кастрычніка 70-годдзе адзначыць Валянцін Елізар'еў, беларускі балетмайстар, народны артыст БССР, народны артыст СССР.

31 кастрычніка — 105 гадоў з дня нараджэння Юльяна Пшыркова (1912 — 1980), беларускага літаратуразнаўца, крытыка, заслужанага дзеяча навукі БССР.

31 кастрычніка — 80 гадоў з дня нараджэння Яўгена Куліка (1937 — 2002), беларускага графіка.

31 кастрычніка 80 гадоў спаўняецца Іне Назінай, беларускаму этнамузыколагу, педагогу.

1 лістапада — 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Верамейчыка (1937 — 1999), беларускага паэта, педагога.

1 лістапада 60 гадоў святкуе Вольга Чарняк, беларускі мастак дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

2 лістапада — 120 гадоў з дня нараджэння Віктара Дарвішава (1897 — 1951), беларускага і расійскага рэжысёра. У 1933 — 1938 гг. — мастацкі кіраўнік БДТ-2.

Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:

27 кастрычніка — *на творчую сустрэчу з пісьменнікам Міколам Чарняўскім у Шчомысліцкую сярэдную школу (Мінскі раён). Пачатак а 14-й гадзіне.*

29 кастрычніка — *на літаратурнае свята, прысвечанае гістарычнай і духоўнай еднасці народаў Беларусі і Расіі, у гімназію № 7. Пачатак а 15.30.*

31 кастрычніка — *на творчую імпрэзу, прысвечаную гістарычнай і духоўнай еднасці народаў Беларусі і Расіі, у СШ № 61. Пачатак а 10-й гадзіне.*

31 кастрычніка — *у Школу юнага паэта пры Мінскім гарадскім аддзяленні СПБ (вул. Фрунзэ, 5-309). Пачатак а 16.30.*

1 лістапада — *на свята паэзіі і песні ў Мінскі абласны каледж (пасёлак Сенніца Мінскага раёна). Ганаровы госць — паэт Міхась Пазнякоў. Пачатак а 12.45.*

2 лістапада — *на творчую сустрэчу з пісьменніцай Янай Явіч і Дзмітрыем Юртаевым у публічную бібліятэку № 5. Пачатак а 10.30.*

2 лістапада — *на прэзентацыю кнігі вершаў юнай паэтэсы Аліны Цвірко «Золото рождающейся дали» ў Фундаментальную бібліятэку Белдзяржуніверсітэта. Пачатак а 16-й гадзіне.*

2 лістапада — *на творчую сустрэчу «Мы і нашы дзеці» з пісьменніцай Вольгай Паўлючэнка ў публічную бібліятэку № 13. Пачатак а 17-й гадзіне.*

Мінскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

31 кастрычніка — *на пасяджэнне секцыі «Проза» вочна-завочнай школы для вучнёўскай моладзі «Са-Творчасць» у Мінскім абласным аддзяленні СПБ (г. Мінск, плошча Свабоды, 13, актавая зала). Пачатак аб 11-й гадзіне.*

2 кастрычніка — *на пасяджэнне секцыі «Паэзія» вочна-завочнай школы для вучнёўскай моладзі «Са-Творчасць» у Мінскім абласным аддзяленні СПБ. Пачатак аб 11-й гадзіне.*

Брэсцкае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

26 кастрычніка — *на пасяджэнне Клуба маладога літаратара ў Доме друку. Пачатак а 18-й гадзіне.*

27 кастрычніка — *на пасяджэнне літаратурнага клуба «Пінчукі» (кіраўнік — пісьменніца Марыя Ляшук) у Пінскую цэнтральную раённую бібліятэку імя Я. Янішчыц. Пачатак а 17-й гадзіне.*

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

27 кастрычніка — *на музычна-паэтычную вечарыну з удзелам гродзенскіх паэтаў «Зямля — аснова ўсёй айчыне», прысвечаную 135-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа, абласны метадычны цэнтр народнай творчасці. Пачатак а 18-й гадзіне.*

31 кастрычніка — *на чарговае пасяджэнне грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» у Гродзенскую абласную навуковую бібліятэку імя Я. Карскага (тэма дыскусіі — «Мой ідэал»). Пачатак а 17-й гадзіне.*

Магілёўскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:

27 кастрычніка — *на мультымедыйны вечар-партрэт «Асоба. Час. Лёс» па творчасці майстра дэтэктыўнага жанру Мікалая Чаргінца з нагоды яго 80-годдзя з удзелам пісьменніка Мікалая Леўчанкі ў цэнтральную раённую бібліятэку г. Быхава. Пачатак а 14.15.*

28 кастрычніка — *на прэзентацыю кніжкі-размалёўкі Ніны Кавалёвай «Ангел над калыбелью» ў бібліятэку-філіял вёскі Цёмны Лес Дрыбінскага раёна. Пачатак а 10-й гадзіне.*

28 кастрычніка — *на сустрэчу аўтара казак і сцэнарыяў мультфільмаў Ганны Сяўбо і рэжысёраў-мультыплікатараў у межах фестывалю «Анімаёўка» ў магілёўскі кінатэатр «Радзіма». Пачатак а 18-й гадзіне.*

29 кастрычніка — *на выступленне паэтэсы Марыны Сліўко падчас рэспубліканскага форуму ўшанавання дынастый чыгуначнікаў у г. Лідзе (Палац чыгуначнікаў). Пачатак а 14-й гадзіне.*

ВЯРТАННЕ «СПАРТАКА»

Менавіта таму **Валянцін Елізар'еў**, рыхтуючыся да юбілею, вырашыў аднавіць гэтую — знакавую і для яго асабіста, і для Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі — пастаноўку: яе пабачылі ў шмат якіх краінах свету. І пасля доўгага перапынку ў працы балетмайстар зноў у тэатры, які лічыў (па праве) сваім домам.

— Трупа прыняла мяне вельмі добра, сардэчна, усе артысты працуюць з захапленнем. У мяне ніякіх заўваг. Як атрымаецца, паглядзім у выніку, — патлумачыў працэс рэпетыцый Валянцін Мікалаевіч і адзначыў:

— Мне здаецца, трэба ствараць свае спектаклі больш якасна, менавіта пастаноўкі, што нараджаюцца на гэтай зямлі, а не знекуль прывозяць для эксплуатацыі. Мне, напрыклад, вельмі падабаюцца ў тэатры галандскія спектаклі, але яны ўзятыя напракат. А ёсць нешта, што тут нараджалася, тут жыло і развівалася, — гэта істотная розніца. Лепш няхай нашы спектаклі потым некуды запрашаюць. Напрыклад, балет «Спартак» я паставіў у 4 краінах, акрамя Беларусі…

Пару тыдняў рэпетыцый — перапынку ў актыўнай працы ў тэатры як і не было. І ўжо 31 кастрычніка той самы загадкавы вынік гэтай працы пабачаць гледачы. У гонар 70-годдзя чалавека, які, па сутнасці, стварыў беларускі балет, у тэатры 2 лістапада адбудзецца юбілейная вечарына з удзелам айчынных артыстаў і зорак сусветнай сцэны. І яшчэ інтрыга: ці будзе працяг…

Фота Кастуся Дробава.

Удакладніў **міністр культуры Беларусі Юрый Бондар**, які асабіста прысутнічаў на перадпрэм'ерным паказе дакументальнага фільма А. Лукашэвіча «Валянцін Елізар'еў. Балет — мастацтва думкі»:

— Валянцін Елізар'еў — гэта прыклад таго, як малады чалавек з інавацыйным мысленнем можа стаць класікам сусветнага балета. Няшмат мы сёння ведаем людзей з такім аўтарытэтам, як у Валянціна Мікалаевіча. Міністэрства культуры на пэўным этапе ўключылася ў падрыхтоўку яго юбілейных мерапрыемстваў. У рамках святкавання з'явіцца абноўлены варыянт балета «Спартак», дзе выкарыстоўваецца новы стыль, новая сцэнаграфія. Мяркую, будзе карысна прадоўжыць паказ «Спартака» на сцэне, тым больш што балет мае поспех у гледачоў: квіткі ўсе прададзены. Сёння ў нашым тэатры ідуць 7 спектакляў Елізар'ева. І, спадзяюся, мы надалей знойдзем форму супрацоўніцтва, зручную і для Валянціна Мікалаевіча, і для трупы тэатра.

Валянцін Елізар'еў стаў галоўным балетмайстрам Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі ў 1973 годзе, доўгія гады з'яўляўся мастацкім кіраўніком беларускага балета, быў дырэктарам — мастацкім кіраўніком Тэатра балета да 2009 года. Што стаіць за гэтымі гадамі — у фільме «Валянцін Елізар'еў. Балет — мастацтва думкі», які можна паглядзець 29 кастрычніка а 22.10 на тэлеканале «Беларусь-1».

Ларыса ЦІМОШЫК

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Супрацоўніцтва

Паразуменне праз мастацтва

Сёлета Беларусь і Эстонія адзначаюць дваццаць пяць год з пачатку ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Дата стала нагодай для правядзення разнастайных мерапрыемстваў у абедзвюх краінах. Толькі ў кастрычніку ў Мінску адкрыліся два сумесныя беларуска-эстонскія выставачныя праекты. Напрыканцы мінулага тыдня адзін з іх стаў афіцыйнай часткай святкавання. Выстаўка ў Мастацкай галерэі імя Міхаіла Савіцкага атрымала назву «Увесь свет — тэатр».

Выстаўка была арганізавана *SED ARTE Gallery* (Талін, Эстонія) пры падтрымцы Пасольства Эстонскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь, Пасольства Рэспублікі Беларусь у Эстонскай Рэспубліцы. У экспазіцыі прадстаўлены творы дваццаці трох эстонскіх і трынаццаці беларускіх творцаў. Сярод эстонскіх мастакоў глядач можа ўбачыць работы такіх аўтараў, як Эдуард Зенчык, Дзмітрый і Ніна Дабравольскія, Вера Станішэўская, Уладзімір Аншон і іншыя. Беларускі бок прадстаўляюць майстры Марта Шматава, Валянціна Шоба, Сяргей Грыневіч, Уладзімір Панцялееў, Ілона Касабука…

— Адносіны Эстоніі і Беларусі развіваюцца паспяхова і дынамічна, — падкрэсліла на адкрыцці праекта Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Эстонскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Мэрыке Кокаеў. — Мы павінны падтрымліваць адзін аднаго ва ўсіх пачынаннях. Гэтым культурным праектам мы дэманструем не толькі паразуменне і павагу, але і глыбокае сяброўства паміж нашымі краінамі, якое павінна ўмацоўвацца. 25 гадоў — нагода для далейшага развіцця сувязяў не толькі палітычных, але і культурных.

Работы (зразумела з назвы праекта) аб'яднаны тэмай агульнай гульні ў межах вялікага працэсу жыцця. Для аўтараў не абавязковыя адсылкі да тэатра і сцэны, ім цікавыя людзі, якія прымудраюцца трансфармаваць рэальнасць у своеасаблівую шоу-праграму. Выстаўка «Увесь свет — тэатр» — працяг маштабнага праекта «Прысвячэнне тэатру» ў Таліне, дзе адзінаццаць мінскіх мастакоў прадставілі сваю творчасць у тэатральных інтэр'ерах сталіцы Эстоніі. Аўтары прысвяцілі праект супрацоўніцтву двух тэатраў — Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай оперы «Эстонія».

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара

Творы Юрыя Хорава.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае глыбокае спачуванне першаму намесніку старшыні СПБ Алене Анатольеўне Стэльмах у сувязі з вялікім горам — смерцю МАЦІ Валянціны Вітольдаўны.

Мінскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі выказвае шчырыя спачуванні першаму намесніку старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алене Анатольеўне Стэльмах у сувязі са смерцю МАЦІ.

Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ выказвае шчырыя спачуванні першаму намесніку старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алене Анатольеўне Стэльмах з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.

Калектыў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» і РВУ «Выдавецкі дом "Звязда"» выказваюць шчырыя спачуванні першаму намесніку старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алене Анатольеўне Стэльмах у сувязі са смерцю МАЦІ.

АБ'ЯЎЛЯЕМ КОНКУРС

на замяшчэнне вакантнай пасады галоўнага дырыжора заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь імя Р. Шырмы».

Кваліфікацыйныя патрабаванні: вышэйшая музычная адукацыя і стаж работы на пасадзе дырыжора харавога калектыву не менш як 5 гадоў.

На працягу месяца з дня апублікавання аб'явы кандыдатуры будуць разглядацца конкурснай камісіяй.

Для растлумачэння ўзніклых пытанняў звяртацца да мастацкага кіраўніка Белдзяржфілармоніі Юрыя Мікалаевіча Гільдзюка па тэлефоне +375 17 331 55 56.

Прыватнае выдавецка-паліграфічнае ўнітарнае прадпрыемства «МІНКОПРЫНТ» нагадвае, што прыём рукапісаў у новы зборнік аўтабіяграфій пісьменнікаў з назвай «Пад небам васілька» заканчваецца 16 лістапада. Выхад зборніка запланаваны на I квартал 2018 года.

Нашы новыя каардынаты:

г. Мінск, вул. Дуніна-Марцінкевіча, д. 4, к. 2, пам. 4Н. Тэл.: 8 017-275-03-22, 8-044-518-97-09. E-mail: minkoprint@mail.ru

Дайджэст

• У межах Года беларускай культуры на Сардзініі (Італія) з 26 кастрычніка па 6 лістапада пройдзе «Беларускі тыдзень мастацтваў — *BELARUS ART WEEK*», паведамляе БелТА. Адкрыццё выстаўкі сучаснага мастацтва Беларусі адбылося 26 кастрычніка ў Кальяры. Праект — маштабны мастацкі форум, які даў магчымасць дэманстрацыі работ на тэму «Над белымі крыламі — мірнае неба Беларусі» не толькі прафесійным творцам, але і аматарам. Сярод удзельнікаў праекта — Юрый Лешык, Людміла Рыбакова, Дзмітрый Траяновіч, Аляксандра Пармон — мастакі, творы якіх бралі ўдзел у міжнародных праектах, займалі прызавыя месцы, а таксама патрапілі ў прыватныя калекцыі за мяжой. Ад маладых прадстаўлены работы Ганны Бутко, Кацярыны Ганчаровай, Настассі Клімовіч, Алены Каспяровіч ды Святланы Канстанцінавай.

• Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Чайка» (рэжысёр — мастацкі кіраўнік тэатра Мікалай Пінігін) выпраўляецца на гастролі ў Кітай. З 2016 года Купалаўскі тэатр — ганаровы сябра Міжнароднай лігі тэатраў «Шаўковы шлях», заснаванай кіраўніцтвам КНР для пашырэння творчых кантактаў. Пастаноўка чэхаўскай п'есы, якая стала лаўрэатам Нацыянальнай тэатральнай прэміі Беларусі, пройдзе на сцэнах гарадоў Чжухай, Гуанчжоу, Сямынь і Цзінань з 9 па 30 лістапада. Для Купалаўскага тэатра гэта ўжо не першае падарожжа ў Паднябесную: у 2014 годзе тэатр браў удзел у Вясновым фестывалі Народнага мастацкага тэатра Пекіна са спектаклямі «Вяселле» і «Не мой».

• У Лондане абвясцілі новага лаўрэата Букераўскай прэміі. Сёлета перамогу ў гэтай прэстыжнай намінацыі (да таго ж і прыз у 50 тысяч фунтаў стэрлінгаў) атрымаў амерыканскі пісьменнік Джордж Сондэрс з раманам «Лінкальн у бардо». У фінале Джордж Сондэрс абышоў Эмілі Фрыдлунд з кнігай «Гісторыя ваўкоў», Фіёну Мазлей з раманам «Элмет», Пола Остэра з творам «4321», Мохсіна Хаміда і яго «Выхад на Захад», а таксама Алі Сміт з кнігай «Восень». «Лінкальн у бардо» — першы вялікі твор тэхаскага пісьменніка, бо раней Сондэрс быў вядомы як аўтар апавяданняў. У раманепераможцы на аснове рэальнага эпізоду апісаная адна ноч з жыцця тагачаснага Прэзідэнта ЗША Аўраама Лінкальна пасля смерці яго 11-гадовага сына.

• Сталі вядомыя імёны чарговых намінантаў на ўключэнне ў Залу славы рок-н-ролу. Самымі верагоднымі пераможцамі лічаць такія папулярныя групы, як *Radiohead* і *Depeche Mode*. Застацца ў Зале славы здолее далёка не кожны выканаўца: перш за ўсё ён павінен прайсці выпрабаванне часам, бо прэтэндэнтам на гэтую ўзнагароду можна стаць праз дваццаць пяць гадоў пасля выпуску першага сінгла: з такім стажам група ці сола-выканаўца можа патрапіць у спіс намінантаў і дайсці да галасавання. Сёлета ў Зале славы таксама могуць апынуцца *Eurythmics, Dire Straits, J. Geils Band, Bon Jovi*, Judas Priest, *The Moody Blues*, спявачка Кейт Буш і рэпер *LL Cool J*. Імёны пераможцаў абвесцяць у снежні.

ФІЛАМАТЫ ЧАКАЮЦЬ ТУРЫСТАЎ,

альбо Які маршрут застаецца для нас нязведаным?

1817 год. У першы дзень кастрычніка, пад покрывам строгай таямніцы, сабраліся ў Вільні пяцёра студэнтаў: Тамаш Зан, Адам Міцкевіч, Язэп Яжоўскі, Анупрэй Петрашкевіч і Францішак Маеўскі. Хлопцы захапляліся навукай, патроху пісалі вершы і праглі лепшай долі для Бацькаўшчыны. Яны стварылі таварыства філаматаў — літаральна: аматары ведаў.

НАПЯРЭДАДНІ

Сёлета мы адзначаем 200-годдзе з дня першага пасяджэння таемнага таварыства. Да гэтай даты ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася выстаўка «Філаматы. Ідэі праз стагоддзі». Яе рыхтавалі сумесна з варшаўскім Музеем літаратуры імя Адама Міцкевіча.

Апроч пасяджэнняў філаматы займаліся яшчэ й падарожжамі. Збіралі песні, паданні, на базе якіх пісалі мастацкія творы. Лагічна, што чарговае «Літаратурнае падарожжа» музея гісторыі беларускай літаратуры выправілася па шляхах філаматаў: Завоссе — Туганавічы — Свіцязь — Навагрудак — Карэлічы — Мір.

ПАЛАНЭЗ ЯК ЭКСКУРСІЯ

Гэта не прыдумка сучаснасці — самая сапраўдная рэчаіснасць XIX стагоддзя. Гаспадары сядзіб сустракалі гасцей і ў рытме паланэза абходзілі падвор'е...

Цяжка ўявіць? Між тым якраз гэта прадэманстравалі ў Завоссі, на сядзібе Міцкевічаў, удзельнікі танцавальнага згуртавання «Капітэль», а з імі — харэограф Алена Прохарава. Гасцей і ўдзельнікаў падарожжа вітаў дырэктар музея-арганізатара Зміцер Яцкевіч. Цяпер, калі стваральніца праекта Лідзія Шагойка не апякуецца літпадарожжамі, праект падтрымлівае Зміцер Лявонцьевіч.

Добрае надвор'е дазволіла гасцям проста на вуліцы пачаставацца малаком.

Гасцінны паланэз на сядзібе Міцкевічаў.

Чаму малако? Гэта адзін з сімвалічных філамацкіх звычаяў: удзельнікі таварыства на сваіх пасяджэннях пілі менавіта гэты напой, які лічыўся знакам чысціні і мудрасці.

Завоссе стала першым прыпынкам, але ўласна падарожжа пачалося многа раней, лічы, з таго самага моманту, калі ўсе занялі свае месцы ў аўтобусе. Яшчэ па дарозе да сядзібы даследчык Зміцер Юркевіч і грамадскі дзеяч Антон Астаповіч распачалі экскурсію. Так, многія мясціны па дарозе на Завоссе і далейшыя пункты падарожжа маюць што распавесці пра дзейнасць філаматаў. Праверце самі.

Зміцер Юркевіч узначальвае арт-суполку імя Тадэвуша Рэйтана, якая займаецца даследаваннем эпохі Рэйтана, захопліваючы крыху ранейшыя часы і часы Міцкевіча ды кампаніі. Цяпер суполка збірае матэрыялы для стварэння ў Грушаўцы музея Тадэвуша Рэйтана.

НЯМЫЯ СВЕДКІ ТАЯМНІЦЫ

Пасёння жыве парк, які належаў роду Верашчакаў. Іх сядзібы няма і следу, а старадаўнія ліпы дасюль шумяць. Выглядае парк даволі дрымуча. Але ў гэтым і ёсць прыгажосць: захавалася атмасфера таямніцы.

Якой? У гэтым парку сустрэліся ўпершыню Адам Міцкевіч і Марыля Верашчака. Векавыя ліпы і дубы-блізняты, якім больш за пяцьсот гадоў, можна лічыць не толькі помнікамі прыроды (ахоўваюцца дзяржавай, дарэчы), але і помнікамі беларускай культуры. Падумайце толькі: не было б гэтага парку, не было б рамантычнай атмасферы, і, хто ведае, быць можа, не займела б таго ракавога эфекту першая сустрэча Адама і Марылі. Не былі б напісаныя «Дзяды»!.. Выглядае на жарт, але хто ведае…

Сёння яшчэ бачныя старыя сцяжыны, па якіх ступіла ножка пані Верашчакі. Парк гэты як бы замкнуўся ў сабе, захоўвае вялікую таямніцу, не раўнуючы: ракавіна — шум змялелага мора.

Парк называюць Туганавіцкім — паводле назвы колішняй сядзібы. Насамрэч ён знаходзіцца бліжэй да вёскі Карчова, чым да Туганавічаў. У той жа вёсцы маюцца ўказальнікі, якія дапамогуць знайсці камень філаматаў. Калі хочаце дайсці да яго, рыхтуйцеся: нават сёння дабрацца да каменя можна толькі пешкі, а ўявіце, як прадзіраліся да яго Міцкевіч, Чачот ды іншыя хлопцы.

Нашто такая таямнічасць, калі можна сабрацца ў мясцовай карчме ды правесці час прыемна і з карысцю? Нагадаем: філаматы былі таварыствам таемным. Настолькі таемным, што пра яго не ведалі нават філарэты, такі сабе філіял філаматаў, кажучы мовай сучаснасці — культурна-адукацыйны праект, кшталту «МовыНанова».

А філаматы заставаліся ў цені. Напачатку культурна-асветніцкія, мэты іх паступова набывалі сацыяльна-палітычнае адценне. Такі паварот мае сумныя наступствы… Для збораў філаматам было неабходнае ціхае, нябачнае месца. Такім стаў лясок наводдаль вёскі Карчова, у якім пасёння стаіць унушальных памераў валун. Каля яго — знак: камень філаматаў.

Сведка філамацкіх таямніцаў.

Здавался б, камень і камень. Але адчуванні ля яго нязвыклыя. Сапраўднае месца моцы. Тут, каля каменя філаматаў, Міхал Бараноўскі праспяваў гімн таварыства. Песню гэтую напісаў у 1819 годзе Адам Міцкевіч. Галоўныя словы гімна — Айчына, навука, сумленне. То былі арыенціры, да якіх імнуліся сябры таварыства.

Фота Аксаны Жлобіч.

Наваградскі пейзаж.

І ЗНОЎ МІЦКЕВІЧ

Па дарозе на Навагрудак быў прыпынак каля Свіцязі. Згадалі творы Міцкевіча, Зана і Чачота, прысвечаныя мясціне, і рушылі далей, на старажытную сталіцу Вялікага Княства Літоўскага.

Дырэктар музея Адама Міцкевіча Мікалай Гайба зладзіў экскурсію для гасцей. Экскурсійны фармат працягнуў Антон Астаповіч, кіраўнік Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры: аглядалі Навагрудак. Найперш, вядома, парэшткі замкавых вежаў, гару Міцкевіча і касцёл, дзе вянчаліся Ягайла і Ядзвіга, а праз сотні гадоў пасля таго быў ахрышчаны Адам Міцкевіч.

Слова пра наваградскія вежы. Закансерваваны мур, які ледзь не знік з твару зямлі праз размытыя пагорак, яшчэ стаіць. Гара пад ім таксама цэлая, праўда, пліты, якія яе ўмацоўваюць, паціху распаўзаюцца ўбакі…

МІРНЫ ФІНІШ

З Навагрудка — у Карэлічы. Якім чынам яны звязаныя з філаматамі? У вёсцы Малюшычы Навагрудская павета Слонімскай губерні нарадзіўся Ян Чачот. Цяпер вёска належыць Карэліцкаму раёну.

Падарожнікі спыніліся каля помніка Яну Чачоту, тут жа Ірына Скок прачытала ўрывак з балады Адама Міцкевіча «Свіцязь. Міхаілу Верашчаку» (дарэчы, чыталася падчас падарожжа шмат што і шмат дзе; Андрэй Мельнікаў спяваў аўтарскія песні).

Апошнім героем дня стаў Ігнат Дамейка. Маёнтак Мядзвядка, дзе нарадзіўся будучы герой Чылі, знаходзіцца за 15 км ад сучаснага Міра. У самім горадзе пасёння стаіць касцёл Святога Мікалая, ля якога захоўваецца камень роду Дамейкаў. Гасцей сустрэў пробашч храма — і проста-такі зачараваў сваім шляхетным абыходжаннем.

Наведаць касцёл у Міры варта і без прывязкі да філаматаў. Фундаваў яго Мікалай Радзівіл Сіротка, а будаваўся храм на стыку XVI — XVII стагоддзяў. Праект храма належыць славутаму майстру Бернардоні. У касцёла няпросты лёс. Так, у 1845 годзе яго рамантавалі на ганарары, сабраныя дзякуючы аб'яўленай Уладзіславам Сыракомлем акцыі перакладу лацінскіх паэтаў на польскую мову. Доўгі час храм належаў праваслаўным вернікам. Толькі ў 1921 годзе яго вярнулі каталікам. Падчас вайны касцёл пацярпеў, але многа больш дасталася яму ў паваенны час. Амаль 30 гадоў таму касцёл каторы раз аддалі каталікам, і з 2001 года вядзецца рэстаўрацыя храма.

Гэтая гісторыя як мага лепш пасуе на фінал падарожжа: у ёй — адлюстраванне гісторыі ўсёй краіны, складанай, шматпакутнай, але нязломна ўпэўненай у добрым зыходзе справы.

ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ

Як зазначылі супрацоўніцы музея гісторыі беларускай літаратуры, гэтая вандроўка была прымеркаваная не толькі да 200-годдзя таварыства філаматаў. Так, цікава агледзець мясціны слаўнай мінуўшчыны. Але гледзячы толькі назад, далёка наперад не зойдзеш.

Літаратурнае падарожжа — разведка боем: дзе памяць пра філаматаў знікае? Якія аб'екты патрабуюць рэстаўрацыі, аднаўлення, папулярызацыі? Ці ёсць шанцы зрабіць маршрут вядомым не толькі сярод аматараў гісторыі ды літаратуры, але і сярод шараговых, у добрым сэнсе слова, турыстаў?..

На апошняе пытанне — адказ станоўчы. Такі маршрут — шляхамі філаматаў і філарэтаў — уключае ў сябе і помнікі архітэктуры, і сляды страчанай спадчыны, і прыродныя аб'екты. Тут спалучаецца экатурызм, гісторыя (прычым — супольная з краінамі-суседкамі) і літаратура. Патэнцыял — бязмежны. Засталося толькі адно: узяць прыклад з філаматаў, аб'яднацца і — рабіць.

Наста ГРЫШЧУК

Постаць і «Постаці»

Зіновій Прыгодзіч пра майстэрства публіцыстыкі і асаблівасці літаратурнага моманту

Цікавы пісьменнік, выдатны журналіст, галоўны рэдактар часопіса «Гаспадыня». Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. Што яшчэ можна дадаць? На сёння толькі адно: лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Гэтую прэстыжную дзяржаўную адзнаку Зіновію Прыгодзічу прынесла публіцыстыка, выдадзеная асобнай кнігай пад назвай «Постаці: з цэлым народам гутарку весці…». А «ЛіМ» прапануе сваім чытачам гутарку з аўтарам, знаёмства з не менш адмысловай асобай, чым самі героі зборніка.

Фота Кастуся Дробава.

— Зіновій Кірылавіч, вельмі разумею і прыхільнасць, і рашэнне экспертнага савета па «Постацях»… На мой погляд (погляд журналіста з працяглым досведам працы ў тэматыцы дзяржаўнай палітыкі), гэта дакладна вельмі моцны палітычны ход — паказаць чалавека як асобу і… неасобу, яго каштоўнасць у сусвеце і сусвет яго маленькага атачэння, яго моц і адначасова слабасць, яго і толькі яго разынку… Дык такое ўменне — гэта талент ці праца?

— Вы правільна вызначылі мэту і сэнс маёй працы. Кніга «Постаці» сапраўды задумвалася і ствaралася як спроба паказаць нашых знакамітых Творцаў, Падзвіжнікаў нацыянальнай культуры рознабакова і з магчымай паўнатой, раскрыць кожнага з іх як Асобу, як выбітную Постаць. Наколькі ўдалося рэалізаваць гэту задуму — меркаваць не мне.

Пытаецеся, што для гэтага трэба — уменне, талент, праца? Можа, і нясціпла ў адносінах да самога сябе так гаварыць, але адкажу: і першае, і другое, і трэцяе. Асабліва важна апошняе. Здаецца, Гётэ аднойчы сказаў, што поспех літаратара на 90 працэнтаў складаецца з працы.

Перш чым ісці да чалавека, з якім мелася быць размова, я старанна, карпатліва вывучаў усё, што пісалася, гаварылася пра яго раней. Падымаў даўнія і нядаўнія падшыўкі газет, часопісаў, прачытваў кнігі, манаграфіі і іншыя матэрыялы. Усё гэта часам займала не адзін месяц.

Пасля наступаў другі этап падрыхтоўкі — вывучэнне праблематыкі той галіны культуры, у якой працаваў мой будучы герой. Трэба было больш-менш прыстойна ведаць учарашні і сённяшні стан гэтай галіны, каб суразмоўца адчуў, што я магу весці размову калі не на роўных, то ва ўсякім разе ў нечым разбіраюся. А гэта вельмі важна, перш за ўсё для таго, каб устанавіць з героем адпаведны кантакт, выклікаць у яго давер.

Некалі наш знакаміты артыст Мікалай Яроменка-старэйшы расказаў мне такую гісторыю. Яму, як дырэктару Купалаўскага тэатра, звоніць маладая журналістка з адной рэспубліканскай газеты і просіць дазволу на сустрэчу, на інтэрв'ю. «Калі ласка, — адказвае Мікалай Мікалаевіч. — Прыходзьце…» І тут журналістка нечакана пытаецца: «Скажыце, а дзе знаходзіцца ваш тэатр?» Яроменка моўчкі паклаў трубку. Ну, якая можа быць размова з чалавекам, які нават не ведае адрас праслаўленага тэатра!

Павучальная гісторыя. Вось чаму, каб не трапіць у такую непрыемную гісторыю, я заўсёды адказна рыхтаваўся да сустрэчы з кожным сваім суразмоўцам. Прадумваў кірунак, канцэпцыю будучай размовы, кожнае пытанне, стараўся, каб чалавеку было цікава адказваць, думаць, разважаць.

— Часам назіраю зняважлівае ці, можа, проста павярхоўнае стаўленне да інтэрв'ю як жанру. Набор пытанняў агульным сэнсам «што чуваць?» Вынікам — даволі сумніўнае апраўданне «ён так і гаварыў». А ці так ты пытаўся?.. Над гэтым задумваюцца радзей. Як вы, Зіновій Кірылавіч, ацэньваеце сучасную публіцыстыку? Імёны, творы? Якасць?

— Спачатку два словы пра інтэрв'ю. Вы, напэўна, заўважылі, што ў сённяшніх сродках масавай інфармацыі галоўны жанр — інтэрв'ю. Відаць, маладыя журналісты палічылі, што гэта самы лёгкі, самы даступны жанр. Глыбокая памылка! Інтэрв'ю — жанр вельмі няпросты, а часам і каварны. І я цалкам з вамі згодны, што іншым разам бывае і смешна, і няёмка, калі журналіст апраўдваецца: «А ён так гаварыў…»

Што тычыцца сучаснай публіцыстыкі, то мяне гэты працэс і радуе, і засмучае. Радуе, бо беларуская публіцыстыка за апошнія дзесяцігоддзі зрабіла ў сваім развіцці пэўны крок наперад. Відавочным з'яўляецца больш шырокая тэматыка журналісцкіх твораў. Адсутнасць цэнзуры дала магчымасць пісаць практычна пра ўсё, пачынаючы ад вытворчай тэмы і заканчваючы самай інтымнай.

На нашых вачах адбылася (і працягвае яшчэ адбывацца) эвалюцыя газетных жанраў. Сёння рэдка можна сустрэць у чыстым выглядзе, скажам, артыкул альбо нарыс. Жанры, узаемадзейнічаючы між сабою, набываюць не ўласцівыя ім раней якасці і тым самым узбагачаюцца.

Сённяшняя публіцыстыка вызначаецца ўзрослай інтэлектуальнасцю, большым літаратурным майстэрствам. Непараўнальна пашырыўся спектр выяўленча-стылістычных сродкаў. Мова ў лепшых узорах радуе нязмушанасцю, раскаванасцю, эмацыянальнасцю.

А засмучае вось што. Хаця тэматыка публіцыстычных публікацый у цэлым пашырылася, можна канстатаваць, што журналісты амаль не заўважаюць вельмі важныя аспекты грамадскага жыцця. Напрыклад, станаўленне і развіццё нацыянальнай ідэі, выхаванне патрыятызму, некаторыя нацыянальна-культурныя праблемы. Мала, невыразна пішацца пра такія страшныя беды, як п'янства і наркаманія.

Сучасная публіцыстыка, як ні дзіўна, пачынае губляць свой аналітычны, даследчы пачатак. Усё больш сустракаецца публікацый апісальных, павярхоўных, зробленых па пранцыпе «што бачу, пра тое і пяю».

Звузілася кола яркіх, таленавітых публіцыстаў. Мне не хацелася б называць тут канкрэтныя імёны, каб каго незнарок не пакрыўдзіць. Дый справа не ў імёнах, а ў тэндэнцыі, пра якую я ўжо сказаў.

— Публіцыстыка — журналістыка ці літаратура? Упэўнена, нашаму чытачу будзе цікавы пункт гледжання чалавека з такім імем, як ваша. Дык дзе тая мяжа?

— Што такое публіцыстыка? Некалі выдатны савецкі журналіст Анатоль Аграноўскі на гэты конт выказаўся так: публіцыстыка пачынаецца там, дзе ёсць думка. У прынцыпе гэта правільна, але занадта агульна. Таму вядомы беларускі журналіст, пісьменнік, навуковец Барыс Стральцоў да гэтага дадаў: там, дзе ёсць не толькі думка, але і пачуцці, эмоцыі.

Публіцыстыка — не жанр, як часам некаторыя думаюць, а стан пэўнага тэксту, спосаб даследавання рэчаіснасці. А жанры гэтых тэкстаў могуць быць самыя розныя: і артыкул, і нарыс, і эсэ, І… гутарка.

Так-так, і гутарка! Спашлюся на думку аднаго з самых аўтарытэтных сучасных даследчыкаў — Алеся Карлюкевіча. Вось што ён сказаў пра «Постаці»: «Аўтар змог знайсці такое выкладанне сваім пытанням, такім чынам іх структураваў, што складваецца ўражанне пра жанравую рэалізацыю сінтэтычнага характару… Інтэрв'ю выйшла за межы традыцыйнага інфармацыйнага жанру. Уключыўшы ў тэксты фрагменты рэпартажнага, эсэістычнага, замалёвачнага характару, аўтар выбудаваў гутарку-нарыс. Перад намі кніга высокавартаснай мастацкай публіцыстыкі…»

Прыводжу гэту цытату зусім не для таго, каб пахваліць сябе вуснамі паважанага, аўтарытэтнага чалавека, а толькі дзеля таго, каб паказаць, што публіцыстыка можа быць відам творчай дзейнасці як журналістыкі, так і літаратуры. Усё залежыць ад узроўню аналітычнасці і эмацыяльна-вобразных сродкаў твора.

— Майстэрства слова, майстэрства літары, коскі й кропкі… Падчас працы ў «ЛіМе» на пачатку 2000-х, дзе загадвала аддзелам публіцыстыкі, пашчасціла працаваць побач з выбітнымі творцамі, калегамі па холдынгу, накшталт Таісы Бондар, Міколы Мятліцкага, Раісы Баравіковай, Анатоля Казлова… Шмат творчага плёну прынесла гэтая прыступка… Вось і моцную школу савецкай, самай рознай па тэматыцы, публіцыстыкі многія лічаць дрэннай апрыёры, хаця, бывае, не ведаюць яе зусім!.. Смешна, калі ў публіцысты часам запісваюць чалавека, які здатны без вялікіх памылак напісаць некалькі абзацаў пра імпрэзу… Я — пра пераемнасць пакаленняў у жанры публіцыстыкі. А можа, і не толькі…

— Канешне ж, наша публіцыстыка не можа развівацца ў вакууме. Яна грунтуецца на трывалым падмурку лепшых традыцый, творчага досведу, закладзеным папярэднімі пакаленнямі журналістаў, пісьменнікаў. Пераемнасць — абавязковая ўмова поспеху ў творчасці. Важна, аднак, каб гэтая пераемнасць дапаўнялася пошукам новых выяўленчых сродкаў, якіх патрабуе сённяшняя рэчаіснасць.

Маё суб'ектыўнае ўражанне — сучасная публіцыстыка перажывае перыяд пэўнага зацішша, нейкага ўнутранага асэнсавання. Але хочацца верыць, што ўжо ў найбліжэйшы час з'явяцца новыя яркія творы, у якіх усхваляванае слова аўтара будзе актыўна ўздзейнічаць на розум і пачуцці чытача, натхняць яго, клікаць да дзеяння. А менавіта ў гэтым сэнс і галоўнае прызначэнне сапраўднай публіцыстыкі.

Размову вяла Інеса ПЕТРУСЕВІЧ

Палачане

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

ДОКТАР

Мой бацька часта пры самых розных размовах называў імёны полацкіх урачоў, з якімі яму давялося працаваць. Не, ён не быў медыкам, ды і сямігадовая адукацыя не магла прывесці яго да гэтай высакароднай прафесіі. Але франтавому інваліду, былому муляру і печніку ў пошуку працы пашчаслівілася пэўны час папрацаваць камендантам інтэрната ў Полацкай школе медсясцёр, дзе выкладалі славутыя полацкія дактары.

Адно з імёнаў тата вымаўляў з асаблівай пашанай. З дзяцінства я запомніў яго. І хоць у дарослым жыцці сустракацца з героем бацькавых аповедаў не давялося, чуў я пра гэтага чалавека нямала.

Адзінаццатае дзіця з сялянскай сям'і на Віцебшчыне, Віктар Антонавіч Ізмайловіч напярэдадні вайны закончыў медінстытут і паехаў па размеркаванні працаваць у Шуміліна, што за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад Полацка.

Імклівае наступленне фашысцкіх войскаў вымусіла медыкаў раённай бальніцы застацца ў зоне акупацыі. Віктар Антонавіч наладзіў сувязь з партызанамі, таемна забяспечваў іх медыкаментамі і перавязачным матэрыялам.

Адна з сувязістак, не вытрымаўшы катавання, выдала на допыце дванаццаць чалавек, якія дапамагалі партызанам. Сярод іх быў і Ізмайловіч. Але арыштаваць Віктара Антонавіча немцы пабаяліся, таму што ён і яго сям'я хварэлі на тыф. Яго проста адправілі ў Полацк у інфекцыйную бальніцу паміраць. Ды, на шчасце, Ізмайловічам было наканавана жыць.

Калі Полацк быў вызвалены ад акупантаў, Віктар Антонавіч і яго жонка Дзіна Сцяпанаўна былі ледзь не адзінымі медыкамі на ўвесь горад.

Маладому доктару давялося аднаўляць гарадскую бальніцу, набіраць штат, выконваць безліч арганізацыйных работ, ствараць школу медсясцёр, станцыю пераліванння крыві і іншых медыцынскіх устаноў, не пакідаючы хірургічнай практыкі. Дарэчы, і мой бацька трапіў пад яго хірургічны нож і быў вельмі ўдзячны доктару за ўдалую аперацыю.

У 1947 годзе ў Полацку быў адкрыты анкалагічны дыспансер, які і ўзначаліў Ізмайловіч. Добраахвотна пакінуўшы пасаду, калі споўнілася шэсцьдзясят пяць гадоў, ён да апошніх дзён займаўся ўрачэбнай практыкай. Пра акуратнасць, добразычлівасць да хворых і да гэтага часу полацкія жыхары і калегі па працы ўзгадваюць з пашанай і падзякай. Два гады таму былыя яго паплечнікі сабраліся разам, каб адзначыць яго стагадовы юбілей. Прагучала нямала добрых слоў пра славутага полацкага доктара.

У мясцовай газеце былі надрукаваны шчырыя рыфмаваныя радкі былой яго падначаленай, аперацыйнай сястры Галіны Мікалаеўны Люцько.

Той, хто жыў не ў сталіцы ці абласных цэнтрах, ведае, як цяжка, але ганарова заслужыць любоў і павагу землякоў. Праца медыка тут, як кажуць, нібы прасвечана рэнтгенам: і майстэрства, і чалавечнасць, калі яны заслужаныя, робяць такіх людзей сапраўднымі народнымі героямі.

Такім быў і полацкі доктар, стваральнік цэлай сямейнай дынастыі Віктар Антонавіч Ізмайловіч. Яго прафесія перадалася і ўнучкам: адна з іх — урач-стаматолаг, другая абараніла дысертацыю па медыцынскай псіхалогіі, трэцяя — мікрабіёлаг. Такім цудоўным святлом адгукаецца жыццёвы і творчы лёс Віктара Антонавіча.

СПАДЧЫНА МІХАСЯ МЯЛЕШКІ:

архіўная, сямейная, духоўная

Міхась Мялешка.

Сляды рэпрэсаванага беларускага гісторыка, краязнаўца, этнографа, архівіста Міхася Мялешкі і яго сям'і на доўгія дзесяцігоддзі згубіліся ў Самары, куды ён быў высланы пасля арышту па так званай справе «Саюза вызвалення Беларусі» і куды за ім паехала неўзабаве жонка Валянціна з пяцігадовай дачкой Люсяй. Толькі ў 1997 годзе — праз год пасля пераезду сям'і ў Пецярбург (запыты ў розныя ўстановы Самары сталіся безвыніковымі) — беларускі гісторык-архівіст Віталь Скалабан адшукаў па адраснай кнізе дачку М. Мялешкі Людмілу Сакалову. У выніку плённага супрацоўніцтва ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва пачала фарміравацца калекцыя дакументаў Міхася Мялешкі, а сувязь падтрымлівала дырэктар архіва Ганна Запартыка. Сувязь раптоўна абарвалася ў 2008 годзе, калі Людміла Сакалова памерла. Аднак праз два гады яе дачка Наталля Спічко, разбіраючы архіў маці, знайшла канверты з мінскім адрасам, і стасункі аднавіліся.

Сёлета нашчадкі беларускага архівіста — унучка Наталля з мужам і сынам — упершыню наведалі беларускую сталіцу, каб узяць удзел у XVII Узвышаўскіх чытаннях, прысвечаных 125-годдзю з дня нараджэння Міхася Мялешкі, урачыстае адкрыццё якіх адбылося ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Нам удалося пагутарыць з захавальніцай сямейнага архіва ўнучкай Наталляй — светлым, разважлівым і адораным чалавекам. Наталля ніколі не бачыла свайго дзеда, бо нарадзілася праз шмат гадоў пасля яго смерці. Аднак падчас размовы з ёй у гэта немагчыма паверыць: Наталля паўтарае дзедавы жыццёвыя запаветы так, нібыта чула іх з яго вуснаў, распавядае дэталі арышту так, нібыта сама была сведкай…

Дзед

— Як і многія іншыя, Міхась Мялешка быў цвёрда перакананы, што гэтае непаразуменне — несправядлівы арышт — неўзабаве вырашыцца, і ўся сям'я, як і раней, будзе жыць у мінскай кватэры. Аднак бабуля Валянціна Віктараўна (у дзявоцтве — Тамкавід) прадчувала бяду, калі перад высылкай мужа ў Самару прыводзіла пад турэмныя паўпадвальныя вокны маленькую дачку — развітацца. Ім дазволілі такое «развітанне»: некалькі разоў прайсціся ля турэмных вокнаў, адкуль дзед мог іх бачыць. Без слоў, без жэстаў і лішніх рухаў. Ці трэба казаць, што крокі іх былі няспешнымі?

Мой дзед быў чалавекам з моцнай воляй і добрым сэрцам. Ужо будучы смяротна хворым (сухоты і рак), ён падтрымліваў, падбадзёрваў бабулю, як толькі мог. Напраўду толькі тое, што каханая жонка і дачушка былі побач, надавала яму сілы жыць.

Дзеда сапраўды вызвалілі ў 1935 годзе, і да паўторнага арышту ў 1938-м сям'я атрымала магчымасць жыць разам — наталяцца драбнюсенькімі крышачкамі шчасця… Былы палітвязень Міхась Мялешка не мог уладкавацца на працу — паўсюль адмаўлялі. Таму бабуля, якая працавала выхавацелькай у дзіцячым доме, заставалася адзіным кармільцам.

Аднак дзядуля не аддаваўся бяздзейснаму адчаю, нават у такой сітуацыі працягваў этнаграфічныя экспедыцыі ў самарскія ваколіцы. Вядома, ён разумеў, што не атрымае ні ўзнагароджання, ні прызнання, і ўвогуле не мог быць упэўнены ў тым, што запісы захаваюцца. «Чалавек павінен быць добрым прафесіяналам, служыць свайму Божаму дару, свайму прыроджанаму таленту і пастаянна развіваць, удасканальваць яго», — так часта паўтараў. Ён не быў азлоблены. Спакутаваны, абяссілены, але не азлоблены. Зноў жа з яго запаветаў: «Чалавецтва дзеліцца на людзей і нелюдзяў. Трэба да ўсіх найперш ставіцца як да людзей і не замыкацца ў злобе і роспачы, а ісці ў свет, шукаць духоўнае святло. Тады абавязкова знойдзеш водгук».

У 1938 годзе Міхася Мялешку арыштавалі паўторна, у 1941 годзе ён сканаў. Быў рэабілітаваны: у 1957 годзе ў Беларусі па першым прысудзе, у 1962 годзе ў Самары — па другім.

Фота Жаны Капусты.

Іван Спічко, Ганна Запартыка, Наталля Спічко, Віктар Скорабагатаў, Васіль Спічко.

Магіла Міхася Мялешкі не захавалася. Жонка і дачка ніколі не былі на яго магіле, нават не ведалі, дзе ён пахаваны.

— Гэта быў наказ дзеда: не хадзіце да магілы, не рызыкуйце сваім жыццём і свабодай. Выпадкі, калі сваякі памерлага або расстралянага вязня прыходзілі на магілу і знікалі без вестак, сапраўды былі. Ён сказаў перад сконам бабулі: «Мая душа — на радзіме, у Беларусі, а цела — проста абалонка, не так важна, дзе яго закапаюць».

Бабуля

— Мая бабуля Валянціна Віктараўна паходзіць з даўняга шляхецкага роду Кладніцкіх. Яе маці Аляксандра Антонаўна скончыла Варшаўскую кансерваторыю і перадала свой талент дачцэ, сама вучыла яе іграць на фартэпіяна. Гэтая традыцыя стала перадавалася ў нашай сям'і па жаночай лініі.

У мінскай кватэры на вуліцы Беларускай, дзе жыла сям'я Мялешкаў, вечарамі часта збіраліся госці: Луцэвічы, Міцкевічы, Жылуновічы… Абменьваліся думкамі, навінамі ў сферы навукі, культуры, літаратуры. На такіх вечарах заўсёды гучала музыка ў выкананні Валянціны Мялешкі — і творы сусветнай музычнай класікі, і беларускія народныя мелодыі.

Пасля арышту і высылкі многія знаёмыя раілі бабулі вырачыся рэпрэсаванага мужа, узяць развод і пастарацца ўладкаваць сваё жыццё — выйсці другі раз замуж, змяніць прозвішча. Але яна гэтага не зрабіла. Калі давялося вызваляць кватэру, Валянціна Віктараўна ўзяла сабе дзве рэчы: наша хатняе фартэпіяна, каб мець магчымасць навучаць дачку, і партрэт дзеда работы мінскага мастака Я. Кругера (ён і цяпер захоўваецца ў сям'і — у нашай піцерскай кватэры). Вельмі шкадавала бабуля страчаную бібліятэку, бо ў дзеда быў найбагацейшы кнігазбор, у тым ліку і рэдкія старажытныя фаліянты. Цешыць думка, што бібліятэка не была знішчана, што хаця б часткамі захавалася недзе ў свеце і служыць людзям.

Так сталася, што мяне амаль з калыскі выхоўвала бабуля. А яна размаўляла са мной на беларускай і польскай мовах, я ведала шмат польскіх і беларускіх вершаў, прыпевак, песенек, прымавак. Гэта не было праблемай, пакуль я не пайшла ў першы клас. У школе мяне сустрэлі больш нават з неразуменнем, чым з недаверам. У першы ж дзень настаўніца пайшла са мной дадому і доўга размаўляла з бабуляй. Пра што канкрэтна, я не ведаю, бабуля ніколі не расказвала. Аднак пасля гэтага папрасіла больш размаўляць па-руску.

Бабуля Валянціна была зламаная горам і перажытам страхам (за лёс сям'і і мужа, якога маглі расстраляць), была моцна напужаная. Ды так, што нават забылася дзень свайго нараджэння, толькі памятала пра сакавік 1902 года. Але, як ні дзіўна, мяне яна выхоўвала моцнай, смелай, актыўнай. Заўсёды паўтарала: не бойся жыцця, рухайся наперад, адстойвай сваю правату! Гэта дапамагло мне дасягнуць у жыцці ўсяго, што маю.

У падлеткавым узросце я сама пачала цікавіцца лёсам дзядулі. Многае мне расказвалі, многае даведалася з турэмных лістоў і паштовак. «Прымаю смерць як збавенне ад кашмарнага жыцця» — так пісаў дзед з турмы незадоўга да скону. Мяне вельмі балюча ўразілі гэтыя радкі: якія пакуты мусіў перажываць чалавек!..

Мама

— Сваё імя мама атрымала ад Янкі Купалы. Больш за тыдзень пасля нараджэння яна не мела імені: перабіралі розныя варыянты. Нехта прапаноўваў назваць дзяўчынку Кларай у гонар Клары Цэткін, нехта — Акцябрынай, бо нарадзілася ў кастрычніку… Потым з камандзіроўкі вярнуўся Купала, разам з Уладзіславай Францаўнай завітаў у адведкі. Ён зазірнуў у калыску, убачыў адкрыты светлы твар і выгукнуў: «Што тут думаць, гэта ж Людміла — людзям мілая!»

Падчас арышту і вобшуку ў кватэры пляжылася ўсё, што магло пакінуць памяць пра чалавека. Садралі са сцяны нават дыплом з Парыжскай этнагарафічнай выстаўкі, які дзед атрымаў за рэканструкцыю беларускай сялянскай хаты, з дакладным увасабленнем начыння: ад мэблі і драўлянага посуду да вышыванак і жаночых упрыгожанняў. Што не знішчылі, канфіскавалі. Аднак фотаздымкі захаваліся!

Гісторыя неверагодная. Маленькая Люся любіла разглядаць татавы здымкі, таму многія апынуліся ў скрынках з цацкамі. Некаторыя — у дзіцячым ложачку, пад матрасам, куды іх прыхоўвала дзяўчынка. Вось так ацалелі здымкі, якія складаюць каштоўную частку дзедавага архіва.

Аднойчы мама сказала мне: «Не думай, што дзядуля згінуў праз палітычнае абвінавачванне, рэпрэсіі. Справа ў людзях, дакладней, у тых, каго ён называў нелюдзямі. Пачуццё зайздрасці такое, што праз нейкую драбязу яны могуць загубіць чалавека». Міхасю Мялешку — паспяховаму навукоўцу, разумнаму ды адукаванаму чалавеку, у якога была цудоўная сям'я ды яшчэ і пяціпакаёвая кватэра, — пазайздросцілі! Дастаткова было аднаго даносу.

Добрая кватэра, як бы дзіка гэта ні гучала, сапраўды была адной з прычын арыштаў, высылак і расстрэлаў. Даводзілася чуць, колькі трагічных гісторый было ў Ленінградзе менавіта праз вялікую кватэру, дзе на сценах віселі арыгіналы шэдэўраў жывапісу. Бацькоў — на расстрэл, дзяцей — у дзіцячы дом, прычым калі дзяцей было некалькі, іх абавязкова раздзялялі, давалі іншыя імёны і прозвішчы. Трагедыя нашай сям'і — не адзінкавы выпадак, а тое, што адбывалася з тысячамі сем'яў…

Сустрэча ў творчасці

— Мы з дзядулем сустрэліся ў творчасці. Калі разбіралі з мамай яго архіў, знайшлі фальклорныя запісы, сабраныя ў самарскіх ваколіцах. Ён запісваў пачутыя ў народзе прымаўкі, песні, вершы. Але запісваў у празаічнай форме, проста перадаваў сюжэт. Я надала гісторыям вершаваную форму і стварыла вакальны цыкл «Самарский туесок» («туесок» — скарбоначка, куфэрак). Наўдачу, не маючы знаёмых, якія б маглі падтрымаць, адправіла ў Маскву — знакамітаму дырыжору, народнаму артысту СССР Мікалаю Някрасаву. І ён зацікавіўся. Урэшце 29 верасня 1989 года «Самарский туесок» прагучаў на першым канале ўсесаюзнага радыё ў выкананні народнага артыста СССР Артура Эйзена.

***

Наталля Спічко даўно пакутуе ад сезоннай алергіі, аднак са здзіўленнем адзначыла, што ў Мінску алергія не праявіла сябе ні разу. «Мабыць, гэта паветра далёкай радзімы так дабратворна паўплывала», — жартуе яна.

Наталля, Васіль і Іван Спічко — цікавая сям'я. Вельмі цёплыя, прыязныя стасункі, любоў і павага адно да аднаго — у кожным слове і жэсце. Акрамя сямейных, іх злучаюць і вельмі моцныя творчыя повязі. Наталля — канцэртмайстар, кампазітар, аўтар музычных рэдакцый чатырох балетаў: «Лаўрэнсія» Аляксандра Крэйна; «Полымя Парыжа» Барыса Асаф'ева; легендарны «Карсар», «Папялушка» Сяргея Пракоф'ева. Заслужаны артыст Расіі Васіль Спічко і яго сын Іван — салісты Міхайлаўскага тэатра. Разам яны ладзяць канцэртныя выступы ў Доме вучоных на Дварцовай набярэжнай.

Галоўныя запаветы Міхася Мялешкі — быць прафесіяналам, служыць таленту, які даў табе Бог, і напаўняць стасункі з людзьмі духоўным святлом — напоўніцу адлюстроўваюць асабістае і прафесійнае жыццё сям'і Спічко. Так у спадчыну перадаецца самы каштоўны скарб.

Падрыхтавала Жана КАПУСТА

ЖЫЦЦЁ ЯК АНТЫЧНАЯ ТРАГЕДЫЯ

Самай вялікай бядой нашай крытыкі ёсць простагаварэнне, калі твор і аўтарская задума знікаюць у наўпроставым ацэначным суджэнні ці пераказе… Між тым самае цікавае заўсёды ў дэталях, падрабязнасцях, у атмасферы, якая ўплывае на ўражлівага чытача іншым разам мацней, чым гладкавыбудаваны сюжэт… Кніга «Уладзімір Дубоўка. Ён і пра яго» вартая таго, каб разважаць пра яе падрабязна і непаспешліва, а не толькі радкамі газетнага артыкула.



Перш чым пачынаць размову пра гэтую незвычайную для нашай літаратуры кнігу, варта ўдакладніць яе жанр. Бо гэта той рэдкі выпадак, калі дакладнае вызначэнне жанру мае прынцыповае значэнне для разумення аўтарскай задумы. У дадзеным выпадку, як вынікае з анатацыі, мы маем справу з «дакументальнай біяграфіяй паэта, якая складаецца з аўтабіяграфічнай прозы, успамінаў сучаснікаў, лістоў, архіўных дакументаў, пададзеных у храналагічнай паслядоўнасці». Але спатрэбіцца трошкі ўвагі, каб разабрацца ў ступені дакументальнасці выдання.

Пры першым знаёмстве з кнігай узнікае жаданне сказаць, што яна ўвабрала ў сябе ўсё жыццё Дубоўкі — ад фотаздымкаў да ўспамінаў людзей, якія былі знаёмыя з паэтам у ссылцы. Сапраўды, на сёння гэта дакладна самае поўнае і шматаспектнае прадстаўленне яго біяграфіі. Але такая шчыльнасць і ўсеахопнасць матэрыялу дасягаецца за кошт таго, што ў кнізе пададзены не зусім дакументы, а вытрымкі з іх. Няма тут і рэцэнзій на творы паэта. Між тым яны маглі б патлумачыць адносіны паміж ім і тагачаснай крытыкай. Звяртае на сябе ўвагу і дзіўная лаканічнасць у некаторых спасылках, асабліва ў тых выпадках, калі згаданыя ў спасылках, з публічным асуджэннем якіх выступаў Дубоўка, у хуткім часе былі асуджаныя судом па розных артыкулах (як публіцыст і пісьменнік Лявон Савёнак, лінгвісты Мікола Байкоў і Сцяпан Некрашэвіч, паэт і перакладчык Нічыпар Чарнушэвіч). Аднак у дадзеным выпадку такая падача матэрыялу — гэта хутчэй не недахоп кнігі, а прыкмета жанру і праяўленне прынцыповай творчай пазіцыі яе аўтара.

Так, так, у кнігі ёсць аўтар, хоць яго імені на вокладцы няма, а на тытуле імя пазначана як імя ўкладальніцы, аўтаркі прадмовы і каментатара. Аднак у нас ёсць усе падставы, каб разглядаць Ганну Севярынец менавіта як аўтара нон-фікшн твора, і меркаванне гэтае грунтуецца на тым, што даследчыца не проста знітоўвае дакументы паэтавага жыцця адпаведна лініі яго лёсу, а выбудоўвае мастацкі вобраз свайго героя і яго часу.

Відавочна, неабходнасць у тлумачэнні жанру «Уладзімір Дубоўка. Ён і пра яго» адчувае і сама стваральніца кнігі, бо ўжо з першых старонак згадвае… Пушкіна. Такое частае і як быццам незразумелае згадванне расійскага паэта вытлумачваецца тады, калі аўтарка называе кнігу, на якую яна арыентавалася, ствараючы жыццяпіс Дубоўкі, — «Пушкін у жыцці» Вікенція Верасаева і выказвае жаданне аднавіць літаратуразнаўчую «традыцыю, якую распачаў Вікенці Верасаеў».

Менавіта са слоў «Ты — Пушкін, я перад табой толькі Дзяржавін», якія быццам бы сказаў Уладзіміру Дубоўку Янка Купала, пачынаецца кніга. Гэтыя словы будуць згадвацца яшчэ не адзін раз, аднак рэальнага пацвярджэння таму, што Купала так думаў, а не жартаваў з маладога самазакаханага паэта, усё ж няма. І наогул невядома, ці былі яны сказаныя... Дзякуючы таму, што ў кнізе перасякаюцца самыя розныя дакументы, чытач мае магчымасць паназіраць, як перакручваў Дубоўка нават самыя простыя падзеі свайго жыцця, ствараючы міфы пра сябе літаральна з нічога.

Іншым разам у яго аўтабіяграфічных аповедах столькі дэталяў і перакананння, што міжвольна верыш і становішся на яго бок, і толькі пазней логіка падказвае, што ўсё магло выглядаць трохі не так для тых, хто быў побач з паэтам. Адпачатку прыняўшы Дубоўку як беззаганнага героя — «новага Пушкіна», — з цяжкасцю разумееш, што многія яго ацэнкі калег прадыктаваныя элементарнай прафесійнай зайздрасцю, прычым прасцей назваць тых, каго Дубоўка любіў (напрыклад, Кузьму Чорнага), чым складаць доўгі шэраг тых, каго ён не любіў.

Эмацыянальныя асобы могуць быць шакаваныя тым, што гэты «герой на белым кані» мог далучыцца да цкавання Міколы Байкова, якога, па сведчанні Яўхіма Кіпеля, у той час «вельмі цкавалі за тое, што выказаўся супроць Маркса» (с. 101). Відавочна, перабірае Дубоўка і ў барацьбе супраць Цішкі Гартнага, якога неаднойчы выстаўляе ў параўнанні з сабой поўным ідыётам, бездарам і злыднем, хоць дакументы паказваюць, што сам Цішка Гартны той жа манетай Дубоўку і не плаціў (с. 65 — 67). Непрыгожа выглядае гісторыя з тым, як з прапазіцыі Дубоўкі былі выключаныя з «Маладняка» тры чалавекі з рускай секцыі, прычым «быў скарыстаны нейкі выпадковы повад», а калі выключаных усё ж аднавілі, Дубоўка заявіў, што сыходзіць з арганізацыі, бо «кінуў пісаць». Аналагічнае інтрыганства, якое павінна было мець вельмі непрыемныя наступствы, можна назіраць і ў адносінах да члена «Маладняка» Нічыпара Чарнушэвіча, пра якога Дубоўка расказваў «па сакрэце», што той «не задаволены палітыкай Кампартыі». Зноў жа, складана чытаць словы Дубоўкі пра тое, што, ваюючы супраць Некрашэвіча і Байкова, ён падаваў даклад у ЦКК ВКП (б), які, па меркаванні самога паэта, «дапамог савецкай грамадскасці разабрацца ў гэтым шкодным выданні».

Інтрыгі, шантаж, маніпуляванне сябрамі і паплечнікамі… Першую палову жыцця Дубоўка паўстае перад чытачом не толькі яскравым паэтам і арганізатарам, але і геніем хайпу. Гэтыя праявы асобы паэта пары «Маладняка» і «Узвышша» ў вельмі няпросты для ўсёй беларускай інтэлігенцыі час, на наш погляд, з'яўляюцца ўскосным адказам на пытанне, чаму Дубоўка, маючы бясспрэчны талент, так і не стаў «беларускім Пушкіным», нягледзячы на тое, што аўтар старанна праводзіць гэтую паралель да апошніх старонак.

Тут трэба аддаць належнае Ганне Севярынец: пры ўсім захапленні сваім героем яна засталася вернай праўдзе і не схібіла, раскрыўшы ўсе карты чужога лёсу, якія мела на руках. Разам з тым чытач мае мажлівасць назіраць за духоўнай эвалюцыяй паэта, які паступова, павольна і не па сваёй волі скідвае белае паліто і становіцца падтрымкай і апорай кожнаму, хто мае ў гэтым патрэбу.

Наогул, кніга падае нам некалькі вобразаў Дубоўкі, старанна выбудаваных аўтаркай. Самаўпэўнены Дубоўка-масквіч, шэры кардынал беларускага літпрацэсу… Арыштант і ссыльны, які мужна змагаецца з выпрабаваннямі лёсу, праяўляючы якраз у гэтыя часы прыродную высакароднасць… Дубоўка-гаспадар, здатны пабудаваць новае жыццё літаральна з пустэчы… Сібірскі Антэй, які бярэ сілу ад зямлі і выводзіць новыя гатункі раслін… Дзед Мароз, які корміць дзятву цукеркамі і жыве клопатамі пра цяжкахворую жонку…

І тут хочацца зрабіць адступленне… Нягледзячы на тое, што выданне прысвечанае Дубоўку і канцэнтруецца на яго асобе, сапраўдным рыцарам без страху і папроку выглядае ў кнізе якраз жонка паэта Марыя. Ні адзін дакумент, ні адзін ліст, ні адно сведчанне не дае сумневу ў тым, што менавіта гэтая жанчына — узор шляхетнасці, розуму, жаноцкасці! У нечым яе лёс больш трагічны, чым лёс самога паэта.

Усё ж Уладзімір Дубоўка быў прыроджаным лідарам, чалавекам магутнага целаскладу і моцнага духу, здатным прыстасоўвацца да самых дзікіх, нечалавечых умоў. Нават у ссылцы ён знаходзіў сабе справу і занятак дзякуючы практычнасці і адсутнасці страху перад любой працай. Марыя паўстае чалавекам абсалютна іншага характару. І калі тое, што перажываў Дубоўка, чытач успрымае як факт біяграфіі паэта, то тое, што адбываецца з Марыяй, успрымаецца на іншым эмацыянальным узроўні, бо лёгка асацыяваць сябе з гэтай зграбнай невялікай жанчынай.

Рамантычная летуценніца, пазбаўленая гаспадарлівасці (і неаднаразова асуджаная за гэта сваякамі Дубоўкі), у нас на вачах ператвараецца ў чалавека, які ідзе за мужам, як Арфей за Эўрыдыкай, у зямное пекла. Прычым ідзе без слёз, пытанняў, абмеркаванняў... З дзіцём, чамаданамі і бляхамі, якія ўпіхваюць ёй клапатлівыя сваякі наверх непад'ёмных валіз, каб карміла мужа. Яна будзе спускацца за ім у пекла кожны раз, бо ў самога Дубоўкі і думкі не было, што можа быць неяк па-іншаму. Немагчыма чытаць без слёз пра тое, як хавала яна ад хворага Дубоўкі факт смерці роднага сына, а ў адказ атрымлівала лісты, дзе цяжка адшукаць словы «родная», «дарагая», «любімая»… І хоць у канцы кнігі ў чытача няма сумневаў, што Дубоўка па-свойму быў прывязаны да жонкі — адданы калі не сэрцам, дык розумам, — яго халаднаватасць і непахіснасць у некаторых пытаннях выглядае на жорсткасць.

Прынцыповая стаўка на асабовае ў падачы матэрыялу якраз і вылучае кнігу сярод іншых публікацый пра Уладзіміра Дубоўку. Першая поўная публікацыя дакументаў па справе Дубоўкі з фондаў навуковай бібліятэкі Акадэміі навук Беларусі, зробленая Уладзімірам Міхнюком у «Полымі» (1996), была сапраўдным адкрыццём для канца мінулага стагоддзя. Але кніга Ганны Севярынец — нешта большае за зборнік дакументаў і сведчанняў. Гэта высокая літаратура, якая прымушае думаць над пытаннямі, пра якія мы часам забываем у кругавароце жыцця. Напрыклад, пра тое, ці прадвызначаем мы свой лёс сваімі ўчынкамі… Пра тое, чым плацяць людзі за сваю прыгажосць і талент. Пра тое, што кожнаму даецца выпрабаванняў роўна столькі, колькі даецца жыццёвай моцы… Лёс Дубоўкі, блізкі па характары падзей да жыцця герояў антычных міфаў, — выдатная глеба для падобных роздумаў.

«Уладзімір Дубоўка. Ён і пра яго» — той рэдкі выпадак у беларускай літаратуры, калі чытач атрымлівае і веды, і эмоцыі, і магчымасць далучыцца да пошукаў новых фактаў пра паэта, чый лёс нікога не пакіне абыякавым.

Ганна КІСЛІЦЫНА

Містыка і прыватны архіў

Кніга «Уладзімір Дубоўка. Ён і пра яго» пабачыла свет у выдавецтве «Лімарыус» у серыі «Беларуская мемуарная літаратура», заснаванай у 2011 годзе. Дагэтуль у серыі выйшлі кнігі пра Яўгена Ціхановіча, Зоську Верас, Ларысу Геніюш і іншых выдатных асоб. Укладальнік, аўтар прадмовы і каментарыя выдання «Уладзімір Дубоўка. Ён і пра яго» — выкладчыца і літаратуразнаўца Ганна Севярынец. Кніга пабачыла свет дзякуючы пісьменніцы, лаўрэату Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святлане Алексіевіч, якая прафінансавала праект.

Напісаць біяграфію Уладзіміра Дубоўкі дагэтуль спрабавалі Юльян Пшыркоў, Янка Саламевіч, Сяргей Шапран, Віктар Жыбуль, Ірына Багдановіч, Дзмітры Бугаёў, Ігар Пракаповіч і многія іншыя. Але кніга Ганны Севярынец, па-першае, мае арыгінальную канцэпцыю, а па-другое, змяшчае шмат лістоў, успамінаў і фотаздымкаў, якія друкуюцца ўпершыню. Апублікаваныя тэксты можна падзяліць на тры групы: успаміны людзей, якія асабіста ведалі Уладзіміра Дубоўку, тэксты самога Уладзіміра Мікалаевіча (аўтабіяграфічныя творы, успаміны пра сучаснікаў, лісты) і архіўныя дакументы. Усе тэксты дадзены ў кнізе на мове арыгінала.

Складаным было пытанне аўтабіяграфічных крыніц. Выкарыстаныя тэксты знаходзіліся ў трох відах: чарнавік, аўтарызаваны машынапіс і друкаваны тэкст. Часам варыянты аднаго і таго ж твора адрозніваліся. Штосьці аўтар сам не хацеў друкаваць, штосьці не прапускала цэнзура. Таму ўкладальніца брала звесткі з усіх трох крыніц. Першасным лічыўся машынапіс, затым — чарнавік, трэцяя крыніца — друкаваны варыянт. Пры фактычных несупадзеннях паміж імі прыводзіліся ўсе варыянты.

Мэтай біяграфіі было расказаць пра Дубоўку не толькі як пра пісьменніка, публіцыста, мовазнаўцу, але і як пра чалавека — супярэчлівага і рознабаковага.

— Пра Дубоўку я даведалася, калі мела ўжо добра за трыццаць, — расказала Ганна Севярынец. — Калі мы вучыліся ў школе, яго не вывучалі. Але як толькі ўзялася за біяграфію Дубоўкі, пачалася містыка. Сустрэліся людзі, якія яго добра ведалі, у мае рукі трапіў прыватны архіў... Было вельмі цікава, што гэта за асоба, бо ўспаміны аб'ядноўваюцца так: не піў, не курыў, кветкі заўсёды дарыў... Але было відавочна: гэта чалавек настолькі маштабны, што не можа вычарпацца «цукровымі» характарыстыкамі...

Яўгенія ШЫЦЬКА

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Ісці па Гарыні

Лагодным становіцца сонца,
І кроў, як раней, не кіпіць...
Шаленцам ці нейкім шалёнцам
Не хочацца восенню быць.

А хочацца ў бацькавай лодцы,
Якая пад плотам згніла,
Ісці па Гарыні бясконца
Услед за вадой — без вясла.

Па Еўропе

Не з пыхаю падпанка ганарыстай,
А з пашпартам у вокладцы гарынскай,

З валютаю, што в'ялкай начарпаў,*
Я па Еўропе вандраваў;

Пабачыў свет, пазбег уяўных церняў,
Не кідаўся на большы кус,
Бо ў пашпарта таго бясконцы тэрмін
І ў той валюты — самы цвёрды курс.

* *В'ялка – вычасаны з вярбіны шуфлік, якім у Давыд-Гарадку выліваюць з лодкі ваду.*

Напалеон

А колькі ні гадоў міне —
Ты будзеш, як і быў…
Твой жыццяпіс вядомы мне
Ад снегу да аліў.

Твой лёс (прасцей ад простага!),
Як брытваю, дзярэ…
Народжаны на востраве,
На востраве й памрэ!

Фотажыццё Юрыя Іванова

У фотажыцці Юрыя Іванова
Каханне размаўляе з лагодай,
Нібыта музыка.

А музыка мроіць пра лагоду,
Нібыта каханне.
А само жыццё мяркуе:

Шчасце ўсё ж такі ёсць,
І яно такое ж,
Як і святло.

Верасень хрызантэмны

Напілася хрызантэма
Вераснёвае расы,
Вераснёвага блакіту,
Вераснёвае красы,
Вераснёвае прасторы
З вераснёвага акна,
А найболей, а найболей —
Вераснёвага віна.

У Японіі далёкай,
На далёкіх астравах
Хрызантэма — сімвал сонца
І, вядома, хараства.
У кастрычніку там свята,
Але ў нас яно раней —
Хрызантэма, хрызантэма
Нам у верасні мілей.
Верасень, нібы садоўнік таемны,
Сном векавым наталяе сады.
Верасень — месяц найбольш
хрызантэмны,
Верасень — месяц найбольш залаты.

Доля прыгожая — у хрызантэмы,
Бо залатое найменне ў яе…
Ёй прысвячаюць паэты паэмы,
А кампазітары — песні свае.

Ты — каралева

У нашых казках слаўна жылі
І каралевы, і каралі…
Дзе тыя казкі?
Дзе тыя сны?
Раптам навекі зніклі яны?!

Я не жадаю, каб так было!
І тое колішняе святло
Вяртаю ў сэрца, як родны боль:
Ты — каралева, а я — кароль.

Не патухае зорка расы,
А патухае зорка слязы.
Не высыхае кропля віна,
А высыхае наша віна.

Будзем казкі нашы любіць,
Будзем вечна з казкамі жыць,
Бо толькі ў казках слаўна жылі
І каралевы, і каралі.

Гэты

І разам з тым, і разам з тым —
Хачу быць Гэтым, а не Тым,
Як не Сабой, то толькі Гэтым!

Бо Гэты… Ён не проста свой,
А ён з вясёлай галавой,
Якую маюць прайдзісветы.
А Той? Таксама ж не чужы,
Але, ну што тут ні кажы,
Ім быць — страшэнная пакута!

Чаму? Не ведаю чаму…
І хочацца сказаць Яму:
— Чаго стаіш? Ідзі… зануда!

Пацалунак у Менску

Мы сустрэнемся на Койданаўскай
вуліцы,
І татарскі месяц дзеля нас
Цераз плот нябесны перакуліцца,
Скрыгатне па шыбах, як алмаз, —

І пасвеціць на Нямігу блізкую
І далей — на мёртвы Людамант.
Будуць сыпацца шкляныя бліскаўкі
І напомняць аб забытай ісціне,
Што і ў харастве жыве падман…

Мы абдымемся і пацалуемся,
Знерухомеем шчасліва… А яшчэ
Ад шклянога пылу не ўратуемся, —
Кроў па нашых вуснах пацячэ.

Пацалунак у Нью-Ёрку

Зла паспытаў і паспытаў дабра,
Я — збіты плод, у лесе — яблык горкі.
Мяне паклікалі галіны і кара
Высакадрэвага Нью-Ёрка.

Мо прырасту за атлантычным днём?
За атлантычным садам вечаровым
Калі не на пачуцці, дык на словы
Пасаладзею; дух свой местачковы
Сагрэю апельсінавым агнём…

Схаваюся ў нью-ёркавай глушы
І здужаю выдатны вершык скласці
Пра філасофскае ныццё аб шчасці
І краты вольныя славянскае душы.

Алена КАЗЛОВІЧ-УСЦІЛОЎСКАЯ

Дакрануся душою

1.

Дакрануся рукою
Да сцен векавечных
І ў думках спынюся…
Не сцены,
А сведкі гісторыі.
Многа раскажуць.
Шкада, не гаворацъ.
Шкада, што не плачуць.
Ці ж ім не баліць?
Хоць і сцены…
Ці змучаны часам?
А чым жа былі яны?
Замкам, калгасам?
Я тут прачытала
На вывесцы дужай,
Што гэта быў кляштар
Закону картузаў…

2.

Пранізліва-шчыра гучыць «Алелюя»,
З касцёла пры кляштары спеў гэты чую.
І водгалас чысты малітвы світальнай
Становіцца радасцю тут жыццядайнай.

Барочны ансамбль быццам бы ажывае.
Працоўны настрой тут усё напаўняе.
Манахі аддана, адказна, рупліва
Свае абавязкі выконваць павінны.

Павінны і хочуць. За шчасце ім гэта.
Зімою, вясною, увосень і летам
Ахвяру маўчання складаюць святую,
Дарогу да неба праз гэта рыхтуюць.

І моляцца шмат за жывых і памерлых,
За родных і блізкіх, чужых і няверных.
І за нашчадкаў, за тых, хто жыць будзе.
За кожнага з нас тут маліліся! Чуйце!

Малітва і праца.
Малітва і праца...
Чаму ж тут руіны?
Магло як так стацца?

Бязлітасна, жорстка
(На жаль, так бывала)
Тут знішчылі святасць.
Манахаў не стала.

3.

Я ведаю, што
Вы сумуеце,
Сцены,
Па Богу,
Па людзях,
Па працы,
Па веры.

Сівая даўніна

Сівая даўніна.
Прыемна акунуцца
Мне сэрцам і душой
У нетры у твае.
Сівая даўніна.
Ты з вежаў Навагрудка
Удалячынь глядзіш
І ззяеш у красе.
Сівая даўніна,
Што ў кляштары картузаў
Маўчаннем векавым
Замольваеш грахі.
Сівая даўніна.
Цябе я не зракуся,
Калі зракуцца нават камяні.
Калі і журавы
Ляцець сюды не будуць,
Аблюбаваўшы цёплае жытло.

Была і застаюся беларускай.
І ты — маё,
А я — тваё
Жыццё.

***

Трывожнымі слязамі
Цякла туга з вачэй.
А мне б хутчэй да мамы,
А мне б хутчэй, хутчэй…

Хутчэй – не спатыкнуцца б,
Парог родны пазнаць.
А дзе ж вы, дзе ж вы, людцы,
Каго мне тут абняць?

Каго б спаткаць, прывеціць,
Аб долі запытаць?
Людзей няма. Тут Бесядзь.
Крыжы адно стаяць.

І могільнікі-хаты.
Калісьці тут жылі.
А што ж за лёс праклятыі?!
Ні гуку. Камяні.

Крывавяць тыя ж раны.
Пакутна плача дождж.
А мне б хутчэй да мамы…
Праз смутак. І праз ноч.

Нясцерпных слоў кашмары
Ці скончацца калі?
Трывожнымі слязамі
Цякуць, цякуць гады.

Серафіма БЕСТАВА

Маё жаданне

Заутра мне б прачнуцца рана-раненька.
Болей спраў зрабіць — адно жаданне.
На анёла — Божага пасланніка
Ускладу надзеі-спадзяванні.
Папрашу здароўя, даўгалецця,
Папрашу спакою для душы.
Дабрыні каб болей стала ў свеце
І каб меней сталі мы грашыць.

Надзея на Бога

Хто мнеў няўдачах, нягодах паможа?
Надзея адна на цябе, Сыне Божы.
Хто шлях мне падкажа ў бездарожжы?
Надзея адна на цябе, Сыне Божы.
Хто супакоіць часінай трывожнай?
Надзея адна на цябе, Сыне Божы.
І хто мне параіць: «Будзь асцярожнай»?
Надзея адна на цябе, Сыне Божы.

Радня па духу

Бялюткія аблокі, быццам з пуху,
Жаўрук кранае іх крылом,
Душа мая, шукай радню па духу,
Каб наталіцца чысцінёй, святлом.
Адужаеш усе перашкоды,
І хопіць сіл адужаць рубяжы.
Бывае, і чужы — радней, чым родны.
Бывае, што і родны як чужы...

Пытанне

Як жыць далей, каго мне слухаць?
А час бяжыць няўмольна.
Праверка сіл, праверка духу,
Праверка нас на здольнасць.
Не трэба слаць папрокаў лёсу
І плакацца ў далоні.
А шчыра дзякаваць нябёсам
За кожны сонца промнік.

Маё сэрца

Ах ты, сэрца маё чуллівае,
Глянь: на вейках сляза дрыжыць,
Навучы мяне быць шчасліваю,
Навучы мяне сонечна жыць,
Ты парай мне, ты падкажы,
Дзе бываю я не права.
Навучы мяне даражыць
Усім тым, што Гасподзь дараваў.
Ах вы, будні мае мітуслівыя,
Што хацела зрабіць, ці паспею?
Навучы, сэрца, быць шчасліваю
І тады, калі гаснуць надзеі.

Антон ШЛІПЧЫК

Апакаліпсіс адмяняецца…

Апавяданне

Сканаў дзень. Сцішаўся вечар. Дасхаўшы да свайго аўтобуснага прыпынку, у прадуктовую краму па штосьці смачненькае да чаю Насця вырашыла па дарозе не зазіраць: ёсць жа, здаецца, у хлебніцы асушак учарашняга батона, ды ладна, і накіравалася дамоў. Ёй варта было толькі павярнуць за пяціпавярхоўку — а там ужо скрозь лёгкі прыцемак вымалюецца абрысы яе зграбнага катэджыка.

«Спачатку будзе дом-Гулівер, а потым — і хацінка-ліліпут», — усміхнулася сама сабе, успомніўшы, як некалі тлумачыла Васілю, дзе яе прыстанак, у якім яшчэ не так даўно бесклапотна пражывала з бацькамі.

Продкам не выпала пакрасаваць на гэтым свеце даўжэй: загінулі ў аўтакатастрофе. У туман перасцярожліва ехалі на «капейцы», а — трэба ж было — на іх спёрся сустрэчны грузавік.

У тыя цяжкія дні, калі, разгубленая, у роспачы, думала, што горачка не перажыве, побач і ачуўся ён, Васіль, аўтамеханік з прыгараднага сельгаскааператыва. Прыгожы, спагадлівы, увішны юнак адразу глыбока запаў у дзявочую душу, падаўся надзейным, дбайным, працавітым і надта кампанейскім.

«Кампаніі і давялі яго, — Насця зноў з горыччу, шкадаваннем, літасцю падумала пра Васіля, — бо з кім хоць мала-веля знаёмых, бывала, дзе ні зляціцца, то — "за сустрэчу", то — "за здароўе", то — проста "не дзеля п'янства акаяннага, а каб не адвыкнуць", жлукціў і жлукціў. І дажлукціўся…».

Узгадалася Насці таксама, як ужо больш за паўгода таму, зірнуўшы на сябе ў люстэрка яшчэ раз, яна ўзяла з камода сумачку і намерылася выправіцца на работу, а ў гэты момант са спальні з учарнелым, дзён колькі не голеным тварам высунулася ўскудлачаная галава мужа. «Гэй, знаёмая!.. Айн момэнт! — Васілёў голас быў хрыплы, зніклы. — З сённяшняга дня п'янствацаць завязваю і падаюся зарабляць, і не толькі на хлеб з маслам…» — выпаліў, як адрапартаваў. У адказ Насця здзекліва перадражніла і пасмяялася: «П'янствацаць завязваю!.. Ха-ха-ха!.. Заракалася, мой ты Васілёк, свіння…» — з грукам зачыніла дзверы і з падворка прыскорыла да аўтобуснага прыпынку, у думках не перастаючы абурацца на мужа і ўшчуваць яго: «Гэта ты завяжаш... Кажаш, падаюся зарабляць… Васілёк! Колькі мы з табою гаварылі, а з цябе як з гусі вада... Пакруціш у нечым гаражы гайкі, чарку зловіш, пад плотам паваляешся — і на гэтым увесь твой промысел скончыцца…». Насця тады яшчэ схамянулася, а ці не ўслых галосіць?..

Ацямілася яна і зараз, бо ўнутраны голас зноў і зноў пытаўся: «Усё-такі дзе будзе Васіль і што робіць?.. З вясны, а ўжо вось восень на дварэ, і почуту ніякага няма. У росшук на яго падаваць — ці якога ліха?.. Хоць бы патэлефанаваў, ці па пошце?!».

…У сваім прыстанку Насця і гэтым разам заспела ўсё так, як і раніцай. «Значыць, і сённяшні мой спадзеў, што гаспадара ўбачу дома, марны», — сумна ўздыхнуўшы, пачала пераапранацца ў дамашняе. І, трэба ж, затарабаніў тэлефон. «Во, а можа, якраз Васіль?» — сэрца з грудзей, здавалася, вырвецца ў бясконцасць… Перавёўшы дух, дацягнулася да трубкі:

— Алё!..

У трубцы нехта, быццам смокчучы ледзянец, пытаўся:

— Прабачце, вы — Настасся?..

Насця насцярожылася:

— Ну, так…

— Добры вечар!

З адказам яна памарудзіла: намагалася ўспомніць, у каго можа быць такі голас (падобных раней быццам бы і не чула).

— Дапусцім, добры…

— Настасся, толькі не палохайцеся…

— Напэўна, нешта з… Васем? Хто вы?

— Ды вы не хвалюйцеся, жывы, здаровы ваш Васіль. Мяне ён папрасіў перадаць вам, што…

— Што?

— Што дамоў, чуеце?.. Што да вас ён, сказаў, больш не вернецца…

Насцю нібы токам шыбанула. Сабраўшыся з духам, з пагардай прамовіла:

— Ну і… настрашыў зайца моркваю!..

— Ва… Ваш Вас… Васіль, — запінаючыся, працягваў мужчына, — сказаў, што сумеснае жыццё ўсё роўна не склеілася, не як галубкі, а быццам кот з сабакам…

Насці зрабілася горача. Разжальваючыся, яна не кеміла, што далей казаць.

— Вой-вой!.. Вы… Вы ж толькі не вазьм… не вазьміце ў галаву… — незнаёмец, як падалося Насці, ужо проста вэдзгаў языком. — Думаць трэба, як далей жыць. Не канец жа свету, не апакаліпсіс…

— То ўжо ж… — У вачах Насці расінкамі заблішчэлі слёзы. Яна паклала трубку. «Мілы мой чалавек! — звярнулася ў думках да таго, з кім толькі што размаўляла па тэлефоне. — Ды ці разумееш ты, незнаёмы дабрадзей, хоць што-небудзь?!»

А тэлефон, між тым, дзвэнкнуў зноў.

— Вы, Настасся, вядома, расхвалявалі-ся… О, лепш бы я зусім не тэлефанаваў вам, — далей нетаропка, як бы падкрэсліваючы, што ён наогул не лёгкі на язык, незнаёмец гаварыў: — Дарэчы, з гадзіну перад гэтым я пад'язджаў да вашага дому, хацеў зайсці, але не змог… Пра такое ўсё ж лепей па тэлефоне сказаць: субяседніка не бачыш, вочы недаверам і падазрэннем не свідруюць…

— А-а!.. Ды не трэба разводзіць антымоніі!.. Паслухайце, вы, мяне не трэба шкадаваць, я як-небудзь сама... Вельмі ўдзячна вам за клопат! — узбуджана, як бы падвёўшы пад размовай рысу назаўсёды, Насця з грукатам паклала трубку і рэзка адышла ад тэлефоннага апарата…

Дамашніх спраў — процьма, але ні за што не хацелася брацца. Цела ўраз як свінцом налілося, спакою ў душы як і не было. Яе Васіль і раней, здаралася, цэлымі тыднямі дзесьці прападаў, але ўсё заканчвалася так, як, мабыць, і павінна было быць. Хоць трымаючыся за платы, увесь у брудзе, ды дамоў прывалакаўся…

Больш за паўгадзіны Насця ў думках ні на хвілю не пераставала то бедаваць, то наракаць, то пагражаць. Васілю ж, безумоўна. «Хм — ён не вернецца… Ну, і няхай!.. Гэткае золата!.. Пасля такога хай толькі ступіць на парог. Я яму, злыдню, устрою Бастылію!.. Колькі ж з мяне можна здзекавацца? Нічога, і адна не прападу. Не з разбітымі ж начоўкамі застаюся… Яшчэ такога мужыка сабе адхаплю!.. Падумаеш — Вася!.. П'янтос, якіх свет не бачыў. З ім, во, і дзіцяці не адважвалася заводзіць. Ад выпівохі ці нармальнае народзіш?».

Тэлефон зазваніў зноў. Насця кінулася да трубкі:

— Алё!..

— Настасся, міленькая, прабачце, калі ласка! Але я проста не магу, каб яшчэ крыху не паразмаўляць з вамі…

— Ды чаго ўжо там!.. Калі «міленькая», то пабалакаем… Я ж пра… свайго… павінна ўсё да дробязяў ведаць. Расказвайце, нічога не ўтойвайце, — спадзявалася: авось хоць якая нітачка з'явіцца, а па ёй тады ўжо — і клубочак. — Адкуль, скажыце, вам столькі ўсяго вядома пра Васіля?.. Вы з ім разам на заробках?

— Не, мы папрыяціліся выпадкова, — субяседнік крыху памарудзіў і праз зубы працадзіў: — А муж вас, між іншым, даўненька ашукваў…

Сабраўшыся з духам, спытала:

— А хоць хто яна?

— Хто ж яго ведае… Я не вельмі ўнікаў у гэта… Хіба дырэктарка якая будзе. Васіль выхваляўся, што, маўляў, прыгажуня, разумніца…

— Пэўна, абое рабое… Што яшчэ казаў?

— Ды ўсяго, каб я перадаў вам пра ягоны намер…

— Хм... А вы… вы, нарэшце, скажаце, хто будзеце? Ці можна вам верыць?..

— Я? Ну, дапусцім, адстаўны кадравы вайсковец, палкоўнік… — мужчына спыніўся, чакаючы, як жанчына адрэагуе на пачутае, пасля паўзы прадоўжыў: — І ўсё-такі неразумны Васіль, неразумны… Такую жанчыну пакінуць!..

— Ну і няхай… Мне ўсё роўна…

— Так-так!.. Так…

— Што — так, так?!.. А вы, я забылася, як вас, палкоўнік у адстаўцы… Вы не ў свае справы, даруйце за нетактоўнасць, не лезьце. Пераказалі мне, што Васіль даручыў — і ўсё!.. — невядома з кім Насця больш не жадала малебны правіць і рашуча паклала трубку. Але тут жа ў думках пашкадавала: «Вось ні за што ні пра што нагрубіла чалавеку. Ён мне спачувае, са мною хораша, а я, нягодніца, так кройнула…».

Палкоўнік у адстаўцы, пачакаўшы, патэлефанаваў яшчэ раз, калі Насця спрабавала ўявіць сабе, як далей ёй, адной, будзе жыць. Не, не гэтак, як дагэтуль, калі Васіль, хоць падоўгу невядома дзе валачыўся, але дамоў усё ж вяртаўся і, што трэба было, рабіў. З-за ягонага п'янства, канешне, злавалася, сердавала, запалялася гневам, але ж кахала дурненькага. А напачатку — яшчэ і як! Душы не чуючы… Якія цудоўныя гэта былі дні, якія казачныя ночы!..

А якім рупным і спрытным гаспадарыкам паказаў сябе, стаўшы законным мужам! Дом газіфікаваў, падвёў ваду і каналізацыю, зрабіў еўрарамонт… Ад шчасця Насця лётала ў нябёсах!

— Алё, алё! — паспяшалася адказаць Насця на чарговы тэлефонны званок ужо мяккім тонам. — Я… Вы прабачце, нагрубіла… Самі ведаеце, такое пачуць. «Дах», не хочучы, паедзе…

— Настасся, алё, Настасся!.. Паверце, мне больш вашага няёмка… Нават неяк балюча… Вы ж гэтак растрывожыліся!.. Думаю, а мо мне зараз прыехаць да вас?..

— Што?.. Прыехаць? Не! Толькі не гэта…

— Вы, Настасся, не прападзеце, вы разумная і вельмі прыгожая… Учора, калі выходзілі з дому на работу, бачыў вас….

— Вось як?!.. Шпіёнілі?..

— Так! І з той мінуты, паверыце, не магу знайсці сабе месца… Які ж ён, мякка кажучы, несур'ёзны, ваш Васіль!.. То хоць да крамы «Пралеска» падыдзіце… Я ў чырвонай «Аўдзі» тут… Мы нават сябры па няшчасці… Жонка мая гэтаксама не з'яўлялася дамоў, не з'яўлялася, а потым патэлефанавала і сказала як адрэзала: «Усё, галубок ты мой харошы! Між намі ўсё скончана, у свой "хорам" мяне з гэтай мінуты не чакай ніколі…» Гэта чыстая праўда… Каб я здох!.. Дык як, мне — чакаць?..

— Дык як? Дык як?.. Не! Не! І яшчэ раз — не!.. — Насця ўся ўздрыгнулася, сэрца яе змітрэнжылася. Памаўчала крыху і апусціла трубку, але руку ад тэлефона адняла не адразу — задумалася: «А да прадмага, відаць, мне ўсё-такі варта пратрэсціся. Батончык з разынкамі да чаю хацела ж… Заадно і на палкоўніка ў адстаўцы вокам кіну — што за пташачка такая? Пэўна, гэткі ж жлуктач, як і Вася будзе… Сабутыльнік!»

Праз якія паўгадзіны Насця, хоць ногі і не слухаліся, увабраўшы галаву ў каўнерык паліто — не дай бог на каго са знаёмых напароцца, — паволі набліжалася да шыкоўнай чырвонай «Аўдзі». У думках на імгненне ўявіла Васіля ў такой жа іншамарцы. «Не, не, хоць некалі і трапаўся пра самую лепшую легкавушку на свеце, але такога ніколі не будзе. Не голены, не стрыжаны, са спітым тварам, з ног да галавы ў брудзе — і каб у гэткай машыне?.. Не. Не!..».

Заднія дзверцы сапраўднага аўтадзіва, калі Насця параўналася з ім, ціха шчоўкнулі і адчыніліся. Не раздумваючы, узяла ды плюхнулася на мяккае сядзенне...

— Вы што… едзеце?.. Куды вы?.. Спыняйце, спыняйце…

— Трошкі, Настасся, адсюль адкоцімся. Тут забаронны знак стаіць. Чаго добрага, аўтаінспектар аштрафуе… Ды вы не бойцеся мяне! — мужчына за рулём быў у шыракаполым, глыбокім капелюшы, да таго ж сядзеў прыгорбленым, і разглядзець яго ў твар, як Насця ні шворыла вачыма, з-за высокіх спінак крэслаў не змагла аніколькі.

— Ды спыняйце ж сваю каламбіну! — патрабавала Насця. — Што вы сабе надумаліся? Я буду выскокваць з машыны… Хто вы?

Чалавек неяк непрыемна — кхе-кхе-кхе… — дзіка зарагатаў.

— Зараз жа спыніце машыну! Я загадваю! Я буду крычаць і біць, ламаць усё, — галосячы, Насця пачала малаціць рукамі па чым пападзе.

«Аўдзі» затармазіла, але за яе вокнамі ўжо не значылася горада. Наваколле ахутвала ўладная цемень.

— Але ж і нейкая… — мужчына, што называецца, на дыбы не станавіўся, звяртаўся да яе лагодна, з павагай. Затое Насця з перапалоху, разрыданая, «перцу» яму не шкадавала:

— Дык вы гэта з паганаю мэтаю!?.. А яшчэ палкоўнік с…аны!..

«Палкоўнік» на момант паўабярнуўся да Насці. Яе абдало ўсю холадам — прыкмеціла вусы, чорныя акуляры. «А ці не маньяк які?» Душа ў адно імгненне перасялілася ў пяткі. Перапужаная, пачала не толькі рукамі, але і нагамі, і плячом штурхаць дзверцы, і, калі тыя нарэшце расхінуліся, жанчына выкулілася на ліпкую зямлю. Усхапілася — і, колькі было духу, пусціліся бегчы ў напрамку горада, агнямі які ўжо віднеўся ажно кіламетраў за тры…

Толькі праз гадзіну ўся ўзмакрэлая, збалбанелая Насця паварочвала на ўласны падворак. Адчыніла веснічкі, зыркнула — і вачам сваім не паверыла, і вушам, што яны ўлавілі. Ля веранды яе ўтульнага доміка стаяла, пабліскваючы ў святле надворнага ліхтара, тая самая «Аўдзі»!?.. Праз шырока расчыненыя дзверцы ў восеньскую прахалодную цемрадзь з легкавушкі грымела «Ах, какая женщина!..», а каля самога аўтадзіва з нагі на нагу пераміваўся… Васіль. І такі хахуля!.. Апрануты ва ўсё з іголачкі, кораценька пастрыжаны, паголены. І ва ўсмешцы — задаволенай, нават, як падалося Насці, зухаватай — паказваў свае белыя-белыя зубы. І прад ёю ўсё вышэй і вышэй уздымаў угору рукі, у адной з якіх былі пальчатка і капялюш, у другой матляліся акуляры і чорны камячок — вусы… Насцю нібы кіпенем абдало.

— Мне б такую! — падхопліваў Васіль услед за гарланіўшай магнітолай.

— Ідзі прэч! — Насцінаму абурэнню і крыўдзе, здавалася, не будзе мяжы.

— А я, вось… — Васіль задаволена, ганарліва паказваў рукой на аўтамашыну. — Прымай, дарагая, некалі паабяцаныя колы аўтапрагрэсу! А ў доме ў дадатак — яшчэ і на дробныя расходы стосік на стале…

— І, пэўна ж, з пляшкай, ды і ці з адной яшчэ, прыпёрся… — пеканула.

Васіль не прамарудзіў заспакоіць і адначасова пахваліцца:

— А я ўжо не п'ю! Каб я здохнуў, ні расінаўкі не ўжываю!.. Прапашчы алкаш, жоначка, перавыхаваўся. Так што апакаліпсіс адмяняецца, — рагочучы, Васіль увесь нібыта свяціўся.

— Шчыра дзякуемо аж падскаківаемо!.. — буркнула зласліва Насця. Вочы яе засціліся слязьмі, заззялі. Надзеяй, пробліскам радасці. А муж не пераставаў лепятаць — казыраў, радаваўся, апраўдваўся: — Не было калі піць... А цягам часу і адвык… І, во, гэтымі ручанькамі зарабляў дзеля паляпшэння нашага дабрабыту грошыкі, стараўся…

— Сыдзі з дарогі, клоўн!.. Дазволь мне ў дом увайсці! — злосць усё яшчэ не пераставала кіпець ва ўсёй Насцінай істоце…

— Клоўн, дурань… Вядома ж... І яшчэ які!.. — Васіль заходзіўся ад пустога смеху. — Во, на «Аўдзі» з шабашкі прыкаціў, а не на кіліме-самалёце прыляцеў…

— Бач ты на яго, палкоўнікам задаўся!.. А людзечкі ж мілыя!.. На табе!.. Вось табе!.. На!.. На!..

Лёсы старадрукаў

ЗАБЛЫТАНЫМІ СЦЕЖКАМІ...

«Хай будуць словы гэтай кнігі лепш за мёд вуснам вашым»

У кнігазборы Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваецца 30 старадрукаў першай чвэрці XVII ст. — прадукцыя друкарняў Расіі, Украіны, Беларусі. Пра некаторыя з гэтых кніг ужо паведамлялася на старонках «ЛіМа» (гл. артыкул Вольгі Губанавай «Загадкавы ўладальнік Трыёдзі»).

Адметныя ўладальнікі і чытачы былі і ў асобніка «Гутаркі на 14 пасланняў апостала Паўла» (Кіеў, 1623). Аўтар твора — Іаан Златавуст (каля 347 — 407 гг.), архіепіскап Канстанцінопальскі. Кніга вялікага памеру (аркушы вышынёй 32 см, шырынёй 19,5 см) і грунтоўнага зместу друкавалася ў Кіева-Пячэрскай лаўры два гады. Яе выданню папярэднічала руплівая праца па выпраўленні перакладу тэксту на царкоўнаславянскую мову, зверка з грэчаскім арыгіналам. Гэтым займаліся запрошаныя заснавальнікам лаўрскай друкарні архімандрытам Елісеем Плецянецкім вядомыя тагачасныя інтэлектуалы Захарый Капысценскі, Памва Бярында, Лаўрэнцій Зізаній. Кніга выйшла з дзвюма прадмовамі, першая была напісана Елісеем Плецянецкім, другая — аўтарам багаслоўска-палемічных твораў Захарыем Капысценскім.

«Гутаркі…» Іаана Златавуста з тлумачэннямі Свяшчэннага Пісання і павучэннямі шырока сталі любімым чытаннем праваслаўных жыхароў Рэчы Паспалітай і Рускага царства. Вось і асобнік акадэмічнай бібліятэкі быў вельмі запатрабаваны, шмат пабачыў і пазнаёміўся з вядомымі гістарычнымі асобамі. Самы ранні запіс з'явіўся ў ім 8 ліпеня 1675 г. у Расіі, дзе кніга апынулася праз нейкі час пасля выхаду з кіеўскай друкарні. У ім пазначалася, што кніга, якая знаходзілася ў цемнікаўскім павеце (цемнікаўскі павет уваходзіў у Азоўскую, а потым Варонежскую губерні) была прададзена дыяканам Андрэем Захар'евым (ці прададзена гэтаму дыякану) у вотчыну Івана Міхайлавіча Міласлаўскага сяло Раждзественнае. Іван Міхайлавіч Міласлаўскі (1635—1685) — асоба вядомая, прыбліжаны цара Фёдара Аляксеевіча Раманава, акольнічы (1660 г.), баярын (1677 г.) і ваявода з роду Міласлаўскіх. Міласлаўскія мелі высокі статус у Рускім царстве з улікам іх роднаснай блізкасці да цара: маці Фёдара Аляксеевіча была народжанай Міласлаўскай.

Наступны запіс паведамляе, што праз пяць гадоў, у снежні 1680 г., кніга была ў якасці ўкладу змешчана ў царкву для памінання душы нябожчыка Рыгора Сідарава, іерэя царквы Прападобнай Марыі Егіпецкай Срэценскага манастыра.

Чарговы запіс паведамляе, што «сія кніга» ўжо належыць думнаму дзяку (думныя дзякі вялі справаводства Баярскай думы) Емяльяну Украінцаву і была набыта ім у царкве Прападобнай Марыі Егіпецкай. Нас зацікавіў той факт, што кніга, змешчаная ў якасці ўкладу паважанай асобы, праз непрацяглы час становіцца ўласнасцю іншай аўтарытэтнай асобы. Гэта можна растлумачыць адмысловымі заслугамі апошняй, а такія заслугі перад царквой Прападобнай Марыі Егіпецкай у Емяльяна Ігнатавіча сапраўды былі. Емяльян Украінцаў (1641 — 1708) — расійскі дзяржаўны дзеяч, дыпламат. У жніўні 1700 г. ён у якасці надзвычайнага пасланніка Пятра Першага ездзіў у Канстанцінопаль для заключэння мірнага дагавора Расіі з Турцыяй, у дар ад Іерусалімскага Патрыярха атрымаў частку мошчаў Прападобнай Марыі Егіпецкай. У лютым 1707 г. сярэбраны каўчэг з мошчамі быў урачыста перанесены ў Срэценскі манастыр.

Кніга не затрымлівалася на адным месцы. У 1722 г., праз 14 гадоў пасля смерці Украінцава, з'явіўся новы запіс, у якім асобнік быў азначаны як уласнасць святара Пятра царквы Іаана Прадцечы, што знаходзілася ў Маскве.

Наступнага ўладальніка асобніка мы высветлілі з дапамогай штампа на кнізе: «Собственное собрание старопечатных и рукописных книг Стефана Федоровича Севастьянова». Стараабрадзец Сцяфан Севасцьянаў (1872 — 1944) жыў у Растове-на-Доне, быў заўзятым калекцыянерам. Усё жыццё ён збіраў старадрукаваныя і рукапісныя кнігі, яго калекцыя дасягала 700 тамоў. Асноўная частка была сабрана самім Сцяфанам Севасцьянавым галоўным чынам у перадрэвалюцыйныя гады, падчас Першай сусветнай, Грамадзянскай войнаў і ў першыя гады савецкай улады, калі кнігі можна было бачыць пакінутымі ў разбітых асабняках, пустых хатах, у зачыненых храмах, у макулатуршчыкаў і гандляроў выпадковымі рэчамі. У міжваенны перыяд Сцяфан Фёдаравіч збіраў кніжныя рэдкасці ў сваіх адзінаверцаў.

Яго сын Міхаіл (1928 — 2006) скончыў Кабардзіна-Балкарскі дзяржаўны ўніверсітэт, добра ведаў і збіраў старадрукаваныя і рукапісныя кнігі. У 1973 г. ён прадаў акадэмічнай бібліятэцы асобнік «Гутаркі...» разам з іншымі кнігамі, якія складалі невялікую частку яго калекцыі.

Асобнік не толькі ўпрыгожваў кнігазборы згаданых асоб. Уладальнікаў і чытачоў у яе было значна больш, у ёй шмат чытацкіх адзнак. Цяжка ўявіць сучаснага чытача, якога заахвоціў бы цяжэзны фаліянт аб'ёмам і вагой з мікрахвалёўку ці набіты рэчамі кейс, які немагчыма гартаць, лежачы на канапе. Трэба мець на ўвазе, што кірылічную кнігу традыцыйна «апраналі» ў пераплёт з драўляных дошак, абцягнутых скурай, што таксама дадавала вагі. Нягледзячы на гэта, наш асобнік часам круцілі, як канспект лекцый перад экзаменам. Гутаркі канстанцінопальскага архіепіскапа былі цікавыя не аднаму пакаленню чытачоў, прычым розных поглядаў. Што прываблівала чытачоў XVII — XX ст., якія запісы і паметы выяўлены на асобніку?

Адзін чытач зрабіў закладкі, наляпіўшы на патрэбныя яму аркушы кнігі палоскі паперы. Другі чытач акуратна пісаў «зри» («глядзі») карычневым чарнілам насупраць тэксту, які прыйшоўся яму даспадобы. Іншы адзначаў упадабанае выказванне скарочана, адной літарай «з», а таксама рыскамі, птушкамі і крыжыкамі на палях. Асобныя старонкі проста ўсыпаны чытацкімі адзнакамі, зробленымі рознымі почыркамі. Хтосьці не абмежаваўся простымі адзнакамі і пакінуў свае выказванні алоўкам: «нужно», «художит» (верагодна, у сэнсе «выкладае па-мастацку»), «бракобор» (бракаборы не прызнаюць неабходнасць шлюбу). Ён папрацаваў больш за ўсіх і нават склаў і запісаў алоўкам на форзацы кнігі спіс асабліва значных месцаў тэксту з указаннем нумароў старонак і стаўбцоў.

Кніга Іаана Златавуста «Гутаркі на 14 пасланняў апостала Паўла» стала важнай для многіх пакаленняў чытачоў. Сапраўды, відаць, прароцкімі былі словы архімандрыта Елісея Пляцянецкага, які напісаў у прадмове да яе: «*...да будут слова книги сея паче меда устам вашим...*».

Алена ЦІТАВЕЦ

Scripta manent

Супрацоўніцтва Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і выдавецтва «Беларуская навука» заўсёды вельмі плённае. Вынікам яго з'яўляюцца цікавыя шырокаму колу навукоўцаў і даследчыкаў выданні, выкананыя на высокім паліграфічным узроўні. Прапануем вашай увазе новыя кнігі 2017 года.

«**Францыск Скарына: асоба, дзейнасць, спадчына**» — зборнік артыкулаў, прысвечаных ураджэнцу Полацка, доктару медыцыны, першадрукару Вялікага Княства Літоўскага, перакладчыку і выдаўцу Бібліі, пісьменніку Францыску Скарыну.

Аўтары артыкулаў прадстаўляюць не толькі розныя краіны, але і розныя галіны гуманітарных ведаў, нацыянальныя і навуковыя школы, розныя падыходы ў даследаваннях. Закранаюцца такія пытанні, як перадумовы дзейнасці Скарыны, мова яго перакладаў кніг Бібліі, значэнне асобных сімвалічных выяў, выкарыстаных друкаром, месцазнаходжанне скарынаўскай друкарні ў Празе, развіццё кнігадрукавання ў Вялікім Княстве Літоўскім пасля Францыска Скарыны. Асобныя артыкулы суправаджаюцца каляровымі ілюстрацыямі.

Напрыканцы выдання змешчаны дакументы Цэнтральнага навуковага архіва НАН і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, звязаныя з падрыхтоўкай юбілеяў беларускага кнігадрукавання ў 1925 і ў 1976 гг. Гэта пратаколы пасяджэнняў, справаздачы, лісты ды іншыя дакументы, якія асвятляюць працэс фарміравання культурных практык, звязаных з ушанаваннем асобы Скарыны ў Беларусі.

Чарговы каталог серыі «**Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации**» адлюстроўвае склад найбагацейшай кніжнай калекцыі князёў Радзівілаў, частка якой захоўваецца ў фондах ЦНБ НАН Беларусі.

Укладальнікі Аляксандр Сцефановіч і Марына Ліс падрыхтавалі першую з трох запланаваных кніг каталога, прысвечанага заходнееўрапейскім выданням 1831 — 1865 гг. Як і раней, бібліяграфічныя запісы выданняў размешчаны ў алфавітным парадку аўтараў і загалоўкаў. Першая кніга ахоплівае літары «А» — «К» і ўтрымлівае апісанні 270 кніг, сярод якіх аднатомнікі, канвалюты і шматтомныя выданні.

Багаты навукова-даведачны апарат робіць работу з каталогам больш зручнай, а шматлікія каляровыя ілюстрацыі даюць магчымасць пазнаёміцца з мастацтвам паліграфіі сярэдзіны XIX ст.

Каталог зацікавіць супрацоўнікаў бібліятэк і музеяў, кнігазнаўцаў, гісторыкаў, філолагаў і ўсіх, хто неабыякавы да кніжнай культуры і духоўнай спадчыны мінулага.

Каталог «**Кириллические издания XVI века**» распачаў серыю каталогаў, прысвечаных кніжнай калекцыі кірылічных выданняў з фондаў ЦНБ НАН Беларусі, і ўтрымлівае навуковае апісанне 25 экзэмпляраў 20 выданняў, якія выйшлі з друкарняў Вільні, Заблудава, Масквы і Астрога ў XVI ст. Укладальнік — Алена Цітавец.

Традыцыйна старадрукаваная кніга разглядаецца, з аднаго боку, на узроўні выдання, усім асобнікам якога ўласцівыя агульныя прыкметы; з другога — на ўзроўні асобнага экзэмпляра з яго ўнікальнымі асаблівасцямі, якія даюць багаты матэрыял для даследаванняў.

Навуковае апісанне выданняў утрымлівае наступныя аспекты: выходныя звесткі, фаліяцыя, сігнатуры, арнаментыка, ступень захаванасці асобніка, вадзяныя знакі, выяўленыя на паперы, запісы, чытацкія паметы, пячаткі і штампы (калі яны прысутнічаюць у выданні), мастацкія асаблівасці пераплётаў і інш.

Каталог утрымлівае багаты ілюстрацыйны матэрыял: выявы пераплётаў, фрагментаў тэксту, гравюр, заставак, канцовак, ініцыялаў, узораў уладальніцкіх ды іншых запісаў. У выданне ўключаны таксама слоўнік тэрмінаў, разнастайныя паказальнікі, спісы і альбом арнаментыкі.

Кніга Алены Цітавец «**Евангелле 1575 года — помнік славянскага кнігадруку XVI стагоддзя: з электронным дадаткам**» прысвечана аднаму з самых прыгожых выданняў славутага беларускага друкара Пятра Цімафеева Мсціслаўца — Евангеллю напрастольнаму, надрукаванаму ў Вільні ў доме Мамонічаў у 1575 г. Мэта даследавання — увесці ў навуковы зварот асобнікі Евангелля з кнігазбору ЦНБ НАН Беларусі. Менавіта на іх засяроджваецца ўвага выдання.

У прадмове распавядаецца пра месца і ролю Евангелля напрастольнага ў жыцці і светапогляд верніка другой паловы XVI ст., адзначаецца каштоўнасць усебаковага даследавання асобнікаў выдання, якія захаваліся.

Кніга складаецца з некалькіх раздзелаў, якія ўмоўна можна падзяліць на два блокі. Першы з іх прысвечаны постаці друкара Пятра Мсціслаўца, разглядаюцца такія аспекты яго дзейнасці, як пачатак кнігадрукарскай справы, супрацоўніцтва з Іванам Фёдаравым, мастацкія асаблівасці яго выданняў, а таксама напісаныя ім тэксты пасляслоўяў.

У другім блоку прадстаўлена інфармацыя па гістарыяграфіі Евангелля напрастольнага 1575 г., згадваюцца асобнікі выдання, якія выяўлены на сёння ў розных краінах свету, указваецца месца захоўвання асобнікаў у межах Беларусі, пасля чаго ўвазе чытачоў прапануецца поўнае навуковае апісанне двух асобнікаў Евангелля з акадэмічнай бібліятэкі Беларусі.

У дадатку, які змешчаны на кампакт-дыску, можна азнаёміцца з лічбавымі копіямі гэтых асобнікаў.

Вольга ГУБАНАВА

Сімфонія Прыдзвінскага краю

«Найдаражэйшыя скарбы — чалавечыя словы» — такі запавет пакінуў нам Францыск Скарына, і, нягледзячы на тое, што мастацтва слова набывае новыя спосабы выражэння, папяровая кніга па-ранейшаму знаходзіць сваіх кансерватыўных прыхільнікаў. Серыя кніг-альбомаў «Культурная спадчына Беларусі» папоўнілася новым выданнем — «Сімфонія стагоддзяў», прысвечаным Полацкай зямлі (Мінск, «Чатыры чвэрці», 2017; пры падтрымцы Белгазпрамбанка). У назве закладзеная не проста выкшталцоная метафара, сэнс яе тлумачыцца дакладна: кніга складаецца з чатырох вялікіх частак: «Вада жывая», «Да вытокаў», «Музыка ў камені», «Даганяючы вякі».



Кніга-альбом выдадзена на беларускай і рускай мовах, кароткае падсумаванне — на англійскай. Падрыхтоўка да друку вялася на высокім прафесійным узроўні, у цесным супрацоўніцтве з Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеем-запаведнікам, Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыром, Саюзам беларускіх мастакоў, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, а таксама Інстытутам літаратуразнаўства імя Я. Купалы НАН Беларусі і Віцебскім дзяржаўным універсітэтам імя П. Машэрава.

Як адзначыла ў пасляслоўных «Нататках выдаўца» дырэктар і галоўны рэдактар выдавецтва «Чатыры чвэрці», Дзвіна невыпадкова стала «галоўнай гераіняй кнігі», бо «менавіта на яе берагах адбывалася мноства гістарычных падзей, якія вызначылі далейшы шлях развіцця дзяржавы». Гэты тэзіс напоўніцу раскрываецца ў тэкстах, аўтарамі якіх выступілі Сяргей Тарасаў, Ліліяна Анцух, Іван Саверчанка, Навум Гальпяровіч. Адметна, што кніга падпарадкавана сімфанічнай структуры не толькі на ўзроўні кампазіцыі, але і на ўзроўні стылю падачы тэксту: чытач атрымлівае не сухую энцыклапедычную даведку, але заснаваныя на асэнсаванні гістарычных фактаў развагі-роздумы з філасофскімі заглыбленнямі, з пастаянным напамінам пра тое, што, якой бы багатай ні была наша культурна-гістарычная спадчына, на самай справе яна нашмат багацейшая, проста многага мы не ведам, бо далёка не заўсёды можам аднавіць разбуранае часам і пахаванае ў старажытнасці.

Сімфанічную танальнасць дапаўняюць цытаты з мастацкіх твораў беларускіх паэтаў: Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, Міхася Башлакова, Надзеі Салодкай, Валянціна Лукшы, Навума Гальпяровіча, Тамары Красновай-Гусачэнкі. Радкі-эпіграфы з вершаў, прысвечаных Полацку, Віцебску, Дзвіне і шырэй — прыроднаму багаццю ўсёй беларускай зямлі, падабраныя скрупулёзна, маюць цесную сувязь са зместам кожнага раздзела і адлюстроўваюць яго агульную настраёвую танальнасць. Сапраўды, фотаздымкі, паэтычныя эпіграфы і празаічны тэкст утвараюць адзіны гарманічны свет, сапраўднае суладдзе розных жанраў.

Вядома, галоўнае ў кнізе-альбоме — работы фотамайстроў (І. Супранёнка, В. Шарстука, Ю. Шэпелева, Ю. Вялітчанка, Г. Івановай, Л. Мержвінскага, А. Мартынюка, І. Раміцан, В. Анцуха, В. Якушкіна, В. Скрабатун), якія ілюструюць прыроднае і культурнае багацце Прыдзвіння. Чытач знойдзе не толькі розныя ракурсы Дзвіны, цэркваў і касцёлаў Полацкага краю, Барысавых камянёў, выявы помнікаў, што ўпрыгожваюць сучасныя плошчы мястэчкаў, але і рэпрадукцыі карцін, старажытных абразоў, габеленаў, архіўных здымкаў. У раздзеле «Даганяючы вякі», прысвечаным славутым ураджэнцам Прыдзвіння, мы ўбачым партрэты Аляксея Сапунова, Івана Хруцкага, Язэпа Драздовіча, Яна Баршчэўскага і многіх іншых.

Вядома, літаратары з асаблівай цікавасцю будуць гартаць старонкі, прысвечаныя пісьменнікам, што нарадзіліся на Віцебшчыне. Героямі гэтага раздзела сталі аўтар унікальнай не толькі для свайго часу, але і сёння «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» Вацлаў Ластоўскі; Янка Журба, чый першы верш на беларускай мове меў назву «На беразе Дзвіны»; сябры полацкага філіяла аб'яднання «Маладняк» Алесь Дудар, Алесь Звонак, Андрэй Александровіч, Валеры Маракоў, улюбёным заняткам якіх былі «начныя блуканні па берагах чароўнай Заходняй Дзвіны»… Ну, і, вядома, Пятрусь Броўка, Уладзімір Караткевіч, Васіль Быкаў… Асобна асвятляецца сучаснае жыццё пісьменніцкай супольнасці: ад літаратурнага аб'яднання «Крыніцы», заснаванага пры наваполацкай газеце «Хімік», да ўтварэння ў снежні 2005 года Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Вядома, гаворка пра Віцебск як прыдзвінскі край не можа абысціся без згадак пра Марка Шагала, музей і Арт-цэнтр, якія носяць яго імя, а таксама іншых мастакоў і скульптараў, што прынеслі славу малой радзіме: Казімір Малевіч, Іегуда Пэн, Восіп Цадкін. У кнізе-альбоме выкарыстаны работы і нашых сучаснікаў — сяброў Віцебскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў.

Распавядаючы пра аб'екты Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (дырэктар — Тамара Джумантаева), аўтары адзначаюць яго ўнікальнасць не толькі для Беларусі і славянскага свету, але і ўсёй Еўропы. Заключная лірычная нота — згадкі Навума Гальпяровіча пра «першую рэчку дзяцінства Палату», родны Полацк, студэнцкі Віцебск… Няспешна ідучы шляхам успамінаў, паэт асвятляе асноўныя моманты ў жыцці Прыдзвіння ў другой палове XX стагоддзя.

Жана КАПУСТА

КАРУНКІ МІНОРНЫХ ВЕРШАЎ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт заўжды абуджае пачуццё гонару за нашу яркую, актыўную і перспектыўную моладзь. Нядаўна ў серыі Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі «Мінскія маладыя галасы» выйшаў першы паэтычны зборнік маладой паэтэсы, студэнткі факультэта міжнародных адносін, лаўрэата шматлікіх паэтычных конкурсаў, актывісткі клуба аматараў мастацкага слова «КЛУмБа» і праектнай каманды «КАРАНІ» Настассі Каротчыкавай.

«До минор» — гэта зборнік вершаў, які прыцягвае ўвагу як афармленнем, так і зместам, а назвы раздзелаў («Верните музыку», «Поздний листопад», «Настежь сердце открыто моё», «Тот самый человек») гучаць як чароўныя ноты прыгожай песні, шчырай і натхнёнай.

Не пакінуць абыякавым вершы, якія Настасся прысвячае самаму дарагому чалавеку ў жыцці — матулі:

Я прошу, оставь свой груз бумажный!
Оглянись, задумчивый прохожий!
Ведь пока бежишь за чем-то важным,
Мама не становится моложе.

Вельмі тонка і ўмела пераплятаецца ў яе творчасці філасофская, пейзажная, гарадская і любоўная лірыка. Не адразу можна здагадацца, што мудрыя думкі, звязаныя ў карункі прыгожых вершаў, — руплівая праца сэрца і водгук душы дваццацігадовай дзяўчыны.

В простом всегда ей сыщется подвох,
Среди банальности найдётся редкость,
Из миллиардов ей доступных слов
Возьмёт одно. И, без сомнений, метко.

Свежае і вострае мысленне, удалая гульня з формай — складнікі, якія робяць вершы Настассі адметнымі, непаўторнымі. А тыя з іх, што пранізаны смуткам, трывогай, асабістымі пачуццямі, не бянтэжаць, як нярэдка бывае ў сучаснай маладой літаратуры, а, наадварот, скіроўваюць да самааналізу.

В стране потерянных людей,
Умерших душ и лишних судеб
Так бедно сущности моей,
Так страшно бресть среди безлюдий.

•••

И в одиночестве топя
Уже бессмысленную жалость,
Я всё ищу, ищу себя.
Но Я ещё не отыскалась.

Кожны верш маладой паэтэсы — своеасаблівы пошук, спроба знайсці незвычайнае ў звычайным, жывое ў, здавалася б, нежывым, белае — у чорным. Гэта пошук свайго «Я», акрылены верай і шчырым спадзевам на здзяйсненне задуманага...

Напрасно тратить жизнь не вижу смысла,
Не так уж много нам отведено.
Давай начнём любить и верить чисто,
И в тёмной комнате нам станет вдруг светло.

Застаецца толькі павіншаваць маладую паэтэсу з вартым дэбютам, пажадаць, каб першая кніга стала шчаслівым пачаткам непаўторнай паэтычнай сімфоніі.

Кацярына РОЎДА

Асобным словам

ПРАЎДА ЯК НАЙВЫШЭЙШАЯ ПАЭЗІЯ

Алесь ЕМЯЛЬЯНАЎ-ШЫЛОВІЧ

Апошняе польскае паўстанне

Аплачам часіну
калі ўсё пачалося,
часіну, калі прагучаў першы стрэл.
Шэсцьдзясят тры дні
і шэсцьдзясят тры ночы
бітвы.
І часіну, калі ўсё скончылася.

Калі на месцы, дзе быў мільён
чалавек,
цяпер пустэча па мільёне чалавек.

Гэты верш Ганны Свіршчыньскай са зборніка «Я будавала барыкаду» (*«Budowałambarykadę»*, 1974) прысвечаны тэме Варшаўскага паўстання, сведкай якога яна была. Пасля паўстання паэтка пераехала ў Кракаў, дзе і пражыла ўсё сваё доўгае жыццё. Шмат паспела: працавала ў дзіцячых часопісах, Тэатры юнага гледача, пісала вершы і прозу для дзяцей і падлеткаў, яе п'есы з поспехам ішлі ў варшаўскіх і кракаўскіх тэатрах, але найбольш яна вядомая сваімі непаўторнымі і жывымі вершамі пра Варшаўскае паўстанне. У той час яна працавала санітаркай і на ўласныя вочы бачыла жахі вайны. Але расказаць пра гэта здолела толькі праз трыццаць гадоў, калі знайшліся словы і форма, каб апісаць перажытае. У вершах са зборніка «Я будавала барыкаду» няма пафасных і кідкіх метафар, шматгранных і складаных вобразаў — затое навідавоку кінематаграфічная дакладнасць і праўда, што і ёсць найвышэйшая паэзія. Пакуты, боль, роспач і страх — усё тое, праз што давялося прайсці тысячам і тысячам людзей, абаронцам Варшавы, ёсць у гэтай кнізе. Гэта храналогія паўстання ад першага да апошняга дня. Цяжка, а можа, і немагчыма знайсці штосьці падобнае ў сусветнай літаратуры. Вершы такой сілы і эмацыянальнай напружанасці мог напісаць толькі чалавек, які прайшоў праз усё гэта. Найлепш за ўсіх сказаў пра Свіршчыньскую літаратурны крытык Стэфан Мількоўскі *(Stefan Milkowski)*: «Праз 30 гадоў пасля падзення нашага Іліёну для нас, траянцаў, з'явіўся Гамер у асобе Свіршчыньскай».

Беларускі чытач мог пазнаёміцца з творчасцю паэткі хіба з тагачаснага часопіса «Иностранная литература» і анталогій, складзеных знанымі перакладчыкамі польскай паэзіі Наталляй Афанасьевай і Уладзімірам Брытанішскім. Па-беларуску 4 вершы Свіршчыньскай упершыню з'явіліся ў анталогіі польскай паэзіі XX стагоддзя, выдадзенай Алегам Лойкам у 2003 годзе.

Ганна Свіршчыньска знайшла словы і збудавала непаўторную барыкаду новай паэтычнай мовы.

ПАТРЫЯТЫЧНЫ ІНТАРЭС

Чым запомнілася праграма *«BELARUS OPEN»*?

Міжнародны форум тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» — добрая нагода не проста ацаніць сусветныя тэатральныя тэндэнцыі, але і ўзгадаць набыткі роднага тэатра ў праграме беларускага шоукейса. У адрозненне ад пастановак гасцей з іншых краін, чые спектаклі ладзіліся цягам двух тыдняў, праграма *BELARUS OPEN* пачалася ў пятніцу і скончылася ў панядзелак, забяспечыўшы аматараў тэатра насычанымі на спектаклі выхаднымі. Гэтыя дні прадэманстравалі актуальны зрэз нашага тэатральнага мастацтва. Некаторыя пастаноўкі спарадзілі спрэчкі і неадназначнае стаўленне. Але калі ёсць жаданне спрачацца, значыць, беларускі тэатр выклікае інтарэс?

Праграма *BELARUS OPEN* распачалася са спектакля «Кар'ера доктара Рауса» па п'есе Віктара Марціновіча ў пастаноўцы Аляксандра Гарцуева: значная для беларускага кнігадрукавання дата ў юбілейны год адлюстраваная і на тэатральнай сцэне. Але «Гістарычна недакладная трагікамедыя», прысвечаная першадрукару, пацвердзіла сваё права на існаванне ў любы час і без прывязкі да даты. Нягледзячы на заяўленую недакладнасць, п'еса не парушае храналогіі: гады жыцця Скарыны адлічваліся, бы хвіліны на гадзінніку з выбуховым механізмам. Мяняюцца абставіны-дэкарацыі, а людзі вакол Францыска, па сутнасці, застаюцца тыя ж. Ён вымушаны круціцца ў коле безупынных палітычных махінацый і несумленных амбіцый. Праблема ў тым, што Скарына разумее рэчы, якія яшчэ не ўсведамляюць яго сучаснікі. Думкі першадрукара пра сваё месца ў свеце і значнасць кнігі паступова пераходзяць да больш глабальных рэчаў: што ёсць народ, часткай якога з'яўляецца Скарына?..

Сцэна са спектакля «Цень думкі нашай».

Зварот да беларускай культуры і літаратуры ў прыватнасці дапамагае айчынным тэатрам весці дыялог з гледачом. Напрыклад, паводле Уладзіміра Караткевіча паставіў спектакль «Сіняя-сіняя» рэжысёр Ігар Казакоў у Магілёўскім абласным тэатры лялек. Гісторыю іншага літаратара адзначылі ў пастаноўцы Ніны Обухавай «Цень думкі нашай», якую прывезлі ў Мінск з Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (Віцебск). Дзея будуецца вакол пісьменніка і драматурга Францішка Аляхновіча. Лёс Аляхновіча быў складаны: творы забаранялі, яго самога абвінавацілі і саслалі ў лагер. Убачыць сцэнічнае ўвасабленне гэтай асобы было цікава, але здаецца, што моцны бок гэтага спектакля — менавіта значнасць асобы Францішка Аляхновіча.

Не знікае цікавасць у нашых тэатраў да твораў рускай класікі. Сваю версію чэхаўскай «Чайкі» прапанаваў рэжысёр Гродзенскага абласнога тэатра лялек Алег Жугжда. П'еса апошнім часам вельмі папулярная ў Беларусі, у тым ліку з-за таго, што дае падставы для трактовак і гульняў з формай. «Чайка» з Гродна — драматычная. Лялечны ў ёй — тэатр Трэплева, які нібыта ўплецены ў канву апавядання: яго часткай становяцца ў пэўных эпізодах героі, жыццё, паводзіны якіх выглядаюць лялечнымі (несамастойнымі) ці надта тэатральнымі. І так Жугжда адказвае на пытанне, чаму страляецца Косця: яго забіла Ніна… сваім некаханнем. Да гэтага разумення нас падводзяць паступова і праз кранальныя — да слёз — сцэны.

Незалежны тэатр танца «Альтана», які займаецца сучаснай харэаграфіяй, паказаў пластычны спектакль паводле аповесці Фёдара Дастаеўскага «Пакорлівая». Перад пастаноўшчыкамі — рэжысёрам Аленай Медзяковай і харэографам Ганнай Корзік паўстала няпростая задача: перадаць падзеі аповесці не сродкамі драматычнага тэатра, а праз танец і музыку. Па сутнасці, галоўныя героі павінны былі станцаваць самоту і адасабленне, складаную ўнутраную барацьбу паміж мужам і жонкай, мужчынам і жанчынай, а ў выніку — прыйсці да кахання і адзінства, непадуладнага нават смерці. Без тэксту не абышлося: ён прысутнічаў, але «за кадрам», словы не належалі артыстам.

У спектаклі Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек «Пансіён *"BELVEDERE"*» ад італьянскага рэжысёра Матэа Сп'яцы таксама абышліся без сцэнічных дыялогаў ды маналогаў: спектакль пастаўлены цалкам без слоў. У «Пансіёне *"BELVEDERE"*» ўсё да месца: і італьянскія песні, што гучаць па радыё, і галасы дыктараў ды герояў серыялаў на тэлебачанні. Асаблівы каларыт дадае праца мастака-пастаноўшчыка Таццяны Нерсісян, якая праз адметную творчую манеру здолела «ажывіць» жыхароў дома састарэлых.

У прэм'ерным спектаклі гэтага лета *«Anti[gone]»* ад Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн» (рэжысёр Аляксандр Марчанка) спалучыліся антычная трагедыя і сучасная дакументальная драма. Дэкарацый амаль не было, ды і навошта лішнія сродкі выразнасці, калі манументальнасць грэчаскай трагедыі падкрэслівалі скульптуры Мемарыяльнага музея-майстэрні З. І. Азгура? Высветлілася, што «Антыгона» Сафокла актуальна гучыць і ў XXI стагоддзі. Тысячы год таму антычны драматург звярнуў увагу на момант, які размяжоўвае справядлівасць і закон. Але як зрабіць паміж імі выбар? Як заўважыў Альбер Камю, «няма Ісціны, ёсць толькі ісціны». Разам з Антыгонай праз спектакль вядуць асабістае даследаванне нашыя сучаснікі. Гісторыі рэальных людзей шчыльна спляліся з гісторыяй галоўнай гераіні трагедыі. Паміж імі палягаюць тысячагоддзі, але здаецца, што ўсе ўдзельнікі пастаноўкі разумеюць адзін аднаго. Яны сутыкнуліся з несправядлівасцю ў розных яе праявах, пачынаючы ад прадузятасці чалавечых стасункаў і нават да непазбежнай смерці. Смелыя асабістыя расповеды беларусаў, што ўзніміліся з месцаў у глядзельнай зале, нібыта падкрэслівалі пазачасавую значнасць падзей. Здавалася, кожны з прысутных можа далучыцца да дзеі, бо ўсе час ад часу сутыкаліся з такімі сітуацыямі. У спектакля *«Anti[gone]»* атрымалася размыць мяжу паміж жыццём і тэатрам.

Сярод іншых пастановак вылучыўся спектакль Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча «Лондан». Каманда з Бабруйска прывезла на форум незвычайную камедыю. У якасці «героя нашага часу» ўзяты сярэднестатыстычны сантэхнік Гена, які ў вольны час займаецца саломапляценнем. Гэтае хобі аднойчы прыводзіць яго ў Лондан: Гена перамагае ў спаборніцтве і едзе прэзентаваць свой выраб у Англію. Спектакль заснаваны на рэальных падзеях, але жыццёвым яго робіць не сама гісторыя, а яе ўвасабленне. Дэталі — моцны бок пастаноўкі. Гэта і дакладна апісаная дарога з дома на работу, дзе лёгка пазнаць звычайныя мінскія маршруты, і фотаздымкі, што паказвае Гена сваім сябрам (угледзьцеся ўважлівей: побач з тэлефонам у нумары лонданскага гатэля ляжыць беларуская вафля «Витоша»), і надзвычай тэхнічны расповед пра жыццё сантэхніка, які можа навучыць пераадольваць не толькі жыццёвыя праблемы, але і сапраўдныя засоры, — усёй пастаноўцы хочацца сказаць шчырае «Веру!». Лексічны запас спектакля, канечне, не для далікатнага слыху, але ці можна распавесці пра жыццё сантэхніка без трасянкі ды лаянкі? Калі не звяртаць увагу на знешнюю атрыбутыку, а паглядзець углыб, то лёгка ўбачыць гісторыю пра выхад з зоны камфорту, дакладней — са звыклага асяроддзя. Цэнтрам сюжэта становіцца падарожжа, пасля якога чалавек вяртаецца дамоў крыху іншы. Галоўнаму герою трэба было паляцець у Лондан, каб адшукаць у самім сабе любоў да Беларусі — так на сцэне ўздымаецца тэма радзімы і праяўленняў патрыятызму. «Лондан» паказаў, што патрыятызм, які можна знайсці ў інтэрнэце і растлумачыць у Вікіпедыі, адрозніваецца ад таго патрыятызму, які насамрэч ёсць у чалавека.

«Лондан» — гэта той выпадак, калі мы, смеючыся, спрабуем расставацца са сваімі заганамі», — заўважыла падчас абмеркавання вынікаў форуму тэатральны крытык і куратар праграмы *BELARUS OPEN* Людміла Грамыка. Сапраўды, падчас паказу смяяліся ў зале гучна і шчыра. У наш час, калі гледачоў у тэатр прываблівацць камедыі, спектаклі кшталту «Лондана» асабліва патрэбныя, бо могуць не проста выклікаць смех, але і нечаму вучыць.

Нечаканае непаразуменне падчас абмеркаванняў выклікаў спектакль «Гэта ўсё яна» па п'есе Андрэя Іванова, пастаўлены ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі Монікай Дабраўлянскай. Ролі выконваюць заслужаная артыстка Беларусі Людміла Сідаркевіч і Дзмітрый Давыдовіч. Яны іграюць адначасова ў дзвюх прасторах: рэальнай і віртуальнай. Месца дзеяння — кватэра, у якой спрабуюць суіснаваць маці з сынам-падлеткам. Пасля смерці мужа і бацькі гэтага маленькага сямейства гора не зблізіла іх, а, наадварот, развяло па розных пакоях. Блізкія людзі больш не могуць размаўляць: усе спробы выйсці на кантакт заканчваюцца спрэчкамі. Але ў інтэрнэце справы ідуць інакш. Схаваўшыся за нікам Тофі, маці пачынае даследаванне жыцця свайго дзіцяці, якое паступова перарастае ў паўнавартасны дыялог. Такія розныя і такія падобныя, яны сварацца ў жыцці, а пасля скардзяцца адно аднаму самі на сябе ў інтэрнэце. Паступова набліжаецца трагедыя, незваротны вынік недарэчнай сітуацыі. На жорсткі фінал паказваюць сімвалічныя прадвеснікі развязкі: вольны герой бясконцага дзяцінства Пітэр Пэн і папугайчык, які не здолеў паляцець для выратавання ўласнага жыцця... Канфлікт паміж бацькамі і дзецьмі — тэма не толькі невычэрпная, але і вельмі адказная. Драматург і рэжысёр паказалі гледачу вострую праблему, але ў некаторых з'явіліся пытанні: ці не трэба было не толькі абазначыць праблему, але і неяк падштурхнуць аўдыторыю да яе вырашэння? Атрымліваецца, як у «Пакорлівай» Дастаеўскага: толькі б прыйсці на 5 хвілін раней, толькі б паспець растлумачыць...

Наогул, беларуская праграма прыцягнула «чалавечым» гучаннем. Спробамі праз тэатр весці дыялог, спрачацца пра тое, што хвалюе ў жыцці. І ў мастацтве: ёсць тэатральныя кірункі, якія ў нас пакуль не надта асвоеныя ці развіваюцца. Але і над гэтым працуюць. Напрыклад, над развіццём такога жанру, як перформанс. Ёсць асобы самааданыя, гатовыя на ахвяры дзеля мастацтва, — гэта можна было зразумець падчас праграмы *PenAtra(C)tion-VIII* у арт-прасторы «Верх». Каб данесці сваю думку, нашы мастакі-перформеры могуць цалкам распрануцца і расфарбаваць усё цела, апынуцца на крыжы, могуць схаваць твар пад халоднай маскай з ільду, загадзя ведаючы, што расплаўляць яе будзе вогненны струмень (проста жах!), хадзіць па бетоннай падлозе басанож (у памяць пра падзелы Рэчы Паспалітай і самаахвярнага Тадэвуша Рэйтана). Сёлета выступы прысвяцілі культаваму беларускаму мастаку і перформеру Алесю Родзіну, які ўласна дэманструе служэнне высокім ідэям у мастацтве.

Некаторыя тэмы, што закранулі спектаклі беларускага шоукейса *«BELARUS OPEN»*, аказаліся балючымі і неадназначнымі. Але калі беларускаму тэатру нешта «баліць», значыць, ён жывы...

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

ДЫСКУСІЯ ЗА ЗАСЛОНАЙ

Падчас сустрэч у рамках «ТЭАРТу» асабліва адчуваецца: наша тэатральная прастора ўтрымлівае шмат пытанняў. Ці ведае тэатр свайго гледача? Ці павінен ён стаяць на ўзвышшы ды фарміраваць густы і погляды на жыццё альбо «ісці ў людзі»? Магчыма, беларусы не асабліва сочаць за пастаноўкамі, таму што жыццё на тэатральнай сцэне і на самай справе — гэта дзве паралельныя рэальнасці?.. Адказы шукалі падчас дыскусіі: што не так у беларускім тэатры?



Сцэна са спектакля «Сіняя-сіняя».

Людміла Грамыка, тэатральны крытык, куратар праграмы *BELARUS OPEN* міжнароднага тэатральнага форуму «ТЭАРТ»:

— Што адбываецца ў беларускім тэатры? Многіх здзівяць лічбы: у нашай 10-мільённай краіне 28 дзяржаўных рэпертуарных тэатраў, і колькасць іх не мяняецца на працягу многіх гадоў. На 10 мільёнаў насельніцтва атрымліваецца 1 800 000 наведвальнікаў тэатраў. Такім чынам, ва ўсёй Беларусі не назбіраецца нават два мільёны гледачоў, а апошнім часам іх колькасць зменшылася на 200 тысяч. Мы губляем аўдыторыю, і разам з тым павялічваецца колькасць камедый у рэпертуарных тэатрах: зараз іх у афішах 76%. Да чаго ўсё гэта прыводзіць? Да дастаткова абсурдных сітуацый, калі адзін за адным выходзяць спектаклі з назвамі «Лэдзі на дзень», «Тэстастэрон», «Гарачыя матулі». Калі глядзіш на такую афішу, адразу ўзнікае пытанне: «Куды мы патрапілі і пры чым тут тэатр?».

Насамрэч камедыі не ратуюць сітуацыю, бо паток гледачоў памяншаецца. Тэатры не думаюць аб тым, што людзей можа прыцягнуць высокамастацкі прадукт ці адкрытая, вострая размова пра надзённае. Калі казаць пра «цяжкавагавыя» рэпертуарныя тэатры, якія ніяк не хочуць мяняцца, атрымліваецца, што задача іх мастацкіх кіраўнікоў — зарабляць грошы. Гэта рэзка звужае тэрыторыю для творчасці, але планы па гледачу, недахоп пастановачных і чалавечых рэсурсаў — моманты, з якімі таксама немагчыма не лічыцца.

У той жа час свет мяняецца, і разам з ім мяняецца тэатр. Апошнія некалькі сезонаў назіраць за нашым тэатральным працэсам становіцца ўсё цікавей. Існуе вялікая колькасць маладых таленавітых людзей, якія спрабуюць працаваць самастойна, вынікі іх працы вельмі годныя. Гэта і наш тэатр лялек, дзе, дзякуючы намаганням Аляксея Ляляўскага, з'явіліся яркія і цікавыя рэжысёры. Аляксей Ляляўскі, Алег Жугжда, Аляксандр Янушкевіч, Ігар Казакоў — гэта наша ўсё, таму што спрабуюць па-іншаму пабудаваць узаемадзеянне з гледачом, здольныя да самаразвіцця. У гэтым сегменце беларускі тэатр імкнецца абуджаць самасвядомасць. Рэжысёры спрабуюць адчыняць дзверы ва ўсе бакі свету, таму што немагчыма існаваць у ізаляцыі. Прыйшло шмат маладых таленавітых беларускіх драматургаў, якія ўжо даказалі сваё права на існаванне ў прафесіі. Праектны тэатр, які ўзнікае час ад часу са сваімі пастаноўкамі, здольны ўплываць на тэатральную свядомасць, паказваць зусім іншы якасны прадукт, па-іншаму арыентаваць сучаснага чалавека. Перш за ўсё я кажу пра спектаклі мінулага сезона «Опіум» (рэжысёр Аляксандр Марчанка) і «Саша, вынесі смецце» па п'есе Наталлі Варажбіт, які паставіў Дзмітрый Багаслаўскі. Сёлета не было такога багатага выбару якасных пастановак, як летась, таму перада мной як куратарам *Belarus Open* стаяла складаная задача. Думаю, тры дні беларускага шоукейса паказалі, якія пытанні трэба вырашаць нашаму тэатру.

Аляксей Ляляўскі, галоўны рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек:

— Тэатр — гэта ў першую чаргу духоўная грамадская практыка, але духоўнасць сёння ёсць не ў кожным спектаклі. Таму і гледачу няма розніцы, на што ісці. Пакуль беларускі тэатр не прыцягне канкрэтных людзей, саюзнікаў, будзе падаць колькасць наведванняў, бо няма зацікаўленасці.

Да таго ж мяне вельмі турбуе наша аглядка на іншых. Арыенціры ціснуць з усіх бакоў. Адна справа — бачыць новае, успрымаць, вучыцца, але капіраваць формы бесперспектыўна. З аднаго боку, канструкцыя тэатра замкнёная, не мае знешніх выхадаў, а з іншага боку, мы спрабуем зразумець, куды трэба ісці. Я заўважыў, што ў Беларусі думаюць не пра чалавека, а разважаюць нейкімі катэгорыямі для пэўных грамадскіх слаёў. Тэатрам трэба звяртацца не да агульных сацыяльных тэм, а да праблемы канкрэтнага чалавека. Хто б ён ні быў: герой, партызан, ваяр, нават наменклатуршчык. Здаецца, у такім падыходзе больш праўды, чым у абагульненні. Мяне глыбока закранулі некаторыя спектаклі з праграмы *Belarus Open*, таму што яны сталі сумленным даследаваннем асобы. Іншыя ж спектаклі выклікалі яркае непрыманне, бо яны, нават калі задзейнічаюць добрых акцёраў, маюць якасную пастаноўку, па сваёй сутнасці фальшывыя, не пра людзей. Прыгожай глянцавай карцінкі недастаткова, хацелася б адпаведны змест. Я за тое, каб рабіць спектаклі проста, ярка і праўдзіва.

Людміла Грамыка, тэатральны крытык:

— Калі казаць пра духоўную практыку, узнікае наступнае пытанне: калі ж мы да яе наблізімся? Сёлета беларускую праграму паказвалі пасля міжнароднай, і з пункту гледжання не толькі прафесійных, але і відавочных рэчаў, заўважны кантраст. Гэтая праблема паўстае вельмі востра. Некаторыя кажуць, што цяпер разбураюцца мастацкія крытэрыі. Пры адсутнасці інстытуцыі, якая б сур'ёзна і паслядоўна займалася аналізам тэатральнага жыцця, атрымліваецца, што кожны чалавек сам сабе крытык.

Таццяна Арлова, тэатральны крытык:

— Я не належу да тых гледачоў, якія ходзяць толькі на камедыі альбо толькі на трагедыі, а па меры магчымасцяў гляджу ўсе спектаклі, бо люблю тэатр наогул і беларускі тэатр у прыватнасці. Калі згадваюць яго праблемы, то асноўнай перашкодай называюць тое, што ў нас няма грошай і ёсць цэнзураванне. Але гэтыя рэчы можна пераадолець, калі вельмі моцна захацець. Сёння адначасова з дзяржаўным рэпертуарным тэатрам развіваецца іншы (і вельмі перспектыўны!) тэатральны рух. Але я заўважаю, што кіраўніцтва рэпертуарных тэатраў вельмі баіцца канкурэнцыі. Тут можна пахваліць Аляксея Ляляўскага, які дазваляе працаваць на сваёй сцэне розным рэжысёрам, а таксама Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, дзе ў новых драматургаў і рэжысёраў ёсць магчымасць праявіць сябе. Сёння ў Беларусі распалася тэатральнае адзінства. Нас мала, мы ўсе адзін аднаго ведаем, і не трэба баяцца канкурэнцыі.

Наконт таго, што адбываецца з публікай: не варта моцна раздзімаць гэтую праблему, бо ў тэатр ніколі не «бегалі» натоўпам. Мы ведаем, што тэатр не заўсёды прыносіць грошы, і працэс наведвання залежыць ад розных прычын. Кажуць, што журналістыка на папяровых носьбітах памірае, пераходзіць у лічбавы фармат. Гэта натуральны працэс. Тое самае адбываецца і тут: у гледача заўсёды будуць запатрабаваныя відовішчы, не звязаныя з тэатрам. Але заўважная праблема — недахоп у Беларусі тэатральных пляцовак. Калектывам няма дзе працаваць. Тая індустрыяльная прастора, якую мы зараз атрымалі і паступова асвойваем (як, напрыклад, *Ок16*), можа стаць не толькі месцам для паказаў спектакляў, але і пляцоўкай для дыскусій, збораў людзей. Мабыць, тады нешта можа скрануцца з месца.

Дзмітрый Багаслаўскі, драматург, рэжысёр, акцёр:

— Сапраўды, вельмі крыўдна, што цяпер у беларускім тэатры існуе раскол. Тэатральнае грамадства ў нас вельмі маленькае, а акадэмічныя тэатры цяжка ідуць на кантакт, і гэта вялікая праблема. Паказальна, што ў беларускім шоукейсе з'яўляецца ўсё больш альтэрнатыўных спектакляў недзяржаўных тэатраў. Гэта сведчыць аб паспяховым развіцці прыватных пастановак. На шчасце, у краіне ўзнікаюць спектаклі незалежных калектываў, якія запатрабаваныя ў гледача. І калі ўжо так здарылася, што беларускі тэатр падзяліўся на дзве часткі, то кожная будзе ісці сваім шляхам.

Таццяна Траяновіч, кіраўнік цэнтра эксперыментальнай рэжысуры:

— Калі ў тэатральнай прасторы сёння існуе нешта новае, то яно існуе не дзякуючы нечаму, а насуперак. Праз вялікі энтузіязм тых людзей, якія хочуць займацца тэатрам. Рэальнай падтрымкі я не бачу. Вы кажаце пра маладое пакаленне; у нас ёсць фестывалі «М@рт-кантакт», «Белая вежа», Нацыянальная тэатральная прэмія... Але ці атрымаў нейкі бонус хаця б адзін малады рэжысёр пасля таго, як трапіў у намінацыю і стаў лаўрэатам? Перамагчы, канечне, прыемна, але далей зноў трэба пачынаць з нуля.

Паміж нашымі рэгіянальнымі і сталічнымі тэатрамі існуе вельмі вялікая дыстанцыя. Дыскусіі, якія адбываюцца ў Мінску, для абласных калектываў далёкія і незразумелыя. Выдатна, што ў Беларусі ёсць глядач, які гатовы прыйсці на нешта новае і цікавае. Але мы жывём у той сістэме, дзе заўсёды ёсць нейкі трэнд, у які павінны патрапіць. Няма разнастайнасці і выбару. Парадаксальна, але глядач не прыходзіць на канкрэтнага рэжысёра ці на твор канкрэтнага драматурга. Глядач ідзе ў будынак тэатра. Таму добра, што зараз вельмі настойліва пачала з'яўляцца нейкая альтэрнатыва. Ёсць пакаленне маладых драматургаў і рэжысёраў, якія так ці інакш працуюць у гэтым кірунку. Але праблема ў тым, што гэта ўсё яшчэ адзінкавыя праекты. Недастаткова разавага паказу. Спектакль павінен ісці ў пракаце хаця б год, каб яго бачылі гледачы. І нават аднаго года жыцця ў нас, як правіла, няма, бо няма пляцоўкі і падтрымкі. У тых умовах, у якіх існуе альтэрнатыўны беларускі тэатр, ужо добра тое, што ён жывы.

Дзіяна Балыка, драматург:

— Мне здаецца, праблема страты гледача пачалася з таго, што ў краіне, на жаль, няма добрага тэатра для дзяцей і падлеткаў. Вельмі мала драматургаў пішуць дзіцячыя і падлеткавыя п'есы. Калі ўжо сфарміравалася кола інтарэсаў, куды ўключаны інтэрнэт і камп'ютарныя гульні, серыялы (а гэта таксама драматургія, якую можна ўбачыць не ўстаючы з канапы), калі дзень на 24 гадзіны запоўнены, моладзь не пойдзе ў тэатр — ёй і так нядрэнна. Школьнікі, якія не ведаюць, што такое тэатр, аўтаматычна не жадаюць ісці на спектаклі. Калі дзіця атрымлівае досвед наведвання якаснага тэатра, яно хоча туды вярнуцца. Трэба заахвочваць маленькага гледача, аднак з гэтым узнікаюць вялікія складанасці. З тэатрам павінны быць звязаныя нейкія адукацыйныя праграмы, бо без гэтага мы не здолеем прыцягнуць новую аўдыторыю.

Кацярына Саладуха, дырэктар фестывалю студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар»:

— Хочацца дадаць колькі слоў у абарону беларускага гледача. Па-першае, не на карысць якаснаму тэатру працуюць прывазныя антрэпрызныя расійскія праекты, якія вабяць гледачоў імёнамі вядомых акцёраў. Кошт квіткоў звычайна высокі, але людзі гатовыя аддаць вялікую суму, каб паглядзець на «зорку» тэлеэкрана. На свой добры спектакль грошай ужо не застаецца... Падругое, гэта багацце антрэпрызы адбівае жаданне ісці куды-небудзь яшчэ. Гледачы «наеліся» камедый, хочуць убачыць якасны тэатр, але беларускім пастаноўкам не давяраюць. Па сваіх тэатральных праектах я ведаю, што беларусам не хапае дыялогу, адкрытай дыскусіі. Менавіта таму пасля абодвух спектакляў праекта *Homocosmos* мы робім дыскусіі. Бачна, што глядач актыўны, яму цікавая тэма, абраная для абмеркавання. На жаль, больш даверу ўзнікае да прыватных эксперыментальных праектаў, чым да дзяржаўных. Што тычыцца моладзі, можна падвесці вынікі «Тэатральнага куфра», дзе сёлета квіткі на ўсе спектаклі былі прададзеныя, забяспечыўшы аншлаг. Малады глядач актыўна ішоў на пастаноўкі, удзельнічаў у абмеркаваннях, быў гатовы ўспрымаць нешта новае. Да новага і варта рухацца беларускаму тэатру.

Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ

АРТБУК — КНІГА XXI СТАГОДДЗЯ?

У кніжных крамах сёння ўсё часцей можна ўбачыць новыя віды кніг — артбукі. Што ж гэта такое? Рускамоўны і куды менш папулярны аналаг слова «артбук» — графічны альбом. Гэта ілюстрацыі на пэўную тэму, сабраныя і афармленыя ў выглядзе альбома. Нельга сказаць, што артбук — вынаходства сучаснасці. Яшчэ ў XIX ст. мастакі збіралі серыі сваіх графічных работ пад адну вокладку і выпускалі як самастойны мастацкі твор. Часцей за ўсё гэтыя альбомы ўяўлялі сабой пейзажныя віды якой-небудзь мясцовасці, выявы архітэктурных аб'ектаў, серыі партрэтаў; яны цалкам афармляліся самімі мастакамі і не ўтрымлівалі ў сабе практычна ніякага тэксту, акрамя подпісаў да работ. Раннімі прыкладамі артбука можна назваць альбом «Хокусай Манга» Кацусіка Хакусая, датаваны 1814 г., выкананы Напалеонам Ордам у 1873—1883 гг. «Альбом гістарычных відаў Польшчы», а таксама «Дэкаратыўныя дакументы» Альфонса Мухі 1902 г.

Артбукі карыстаюцца сёння велізарнай папулярнасцю ў мастакоў ва ўсім свеце. Сучасны артбук мае больш складаную структуру і мастацкую канцэпцыю: гэта друкаванае выданне з работамі мастака на адну агульную тэму, нешта сярэдняе паміж кнігай і часопісам. Ёсць мноства розных відаў артбукаў, якія маюць рознае прызначэнне, структуру і аб'ём, паколькі сам фармат такога альбома абумоўлівае поўную свабоду аўтара ў задуме. Многія маладыя мастакі ствараюць альбомы са сваімі работамі ў электронным выглядзе і размяшчаюць у інтэрнэт-прасторы як партфоліа з мэтай папулярызаваць сваю творчасць, зрабіць яе вядомай. Лічбавая форма работ дазваляе мастакам прадстаўляць сваю творчасць за межамі галерэй або музеяў, распаўсюджваць у шырокія масы.

Адзін з самых цікавых і распаўсюджаных відаў артбукаў сёння — рэкламны артбук — альбом, прысвечаны гісторыі стварэння прадукту масавай культуры, напрыклад, папулярных кінафільмаў і камп'ютарных гульняў. Такія альбомы арыентаваны на фанатаў і ўтрымліваюць работы мастакоў і дызайнераў, якія бралі ўдзел у распрацоўцы прадукту і стварэнні мастацкага вобраза, канцэпцыі ўсіх візуальных элементаў, а таксама кароткую пісьмовую інфармацыю пра розныя аб'екты і з'явы выдуманага свету. Можна сказаць, што рэкламны артбук — гэта ілюстраваная энцыклапедыя, якая апісвае асаблівасці выдуманага свету фільма або відэагульні, а таксама гісторыю стварэння прадукту, інтэрв'ю з аўтарамі ідэі і мастакамі, уключаючы пачатковыя задумкі і вобразы, якія не ўвайшлі ў канчатковы вынік. Аднак у адрозненне ад энцыклапедыі тут галоўную ролю адыгрывае не тэкст, а малюнак.

Ілюстрацыі, якія змяшчаюцца ў артбуку, прысвечаным камп'ютарнай гульні або фільму, уяўляюць ужо гатовы і цэласны вобраз, таму іх задача — у тым, каб перадаць гэты вобраз, паказаць атмасферу і стылістыку прадукту ў цэлым і звярнуць увагу гледача на працу дызайнераў, прадуманасць кожнага элемента выдуманага свету.

Найбольшую цікавасць у мастацкім плане ўяўляюць артбукі, прысвечаныя камп'ютарным гульням, паколькі менавіта тут творчасць мастакоў і дызайнераў адыгрывае асноўную ролю. Камп'ютарная гульня — гэта з'ява на стыку кінематографа, выяўленчага мастацтва і літаратуры, прадукт творчасці мноства мастакоў і сцэнарыстаў. Ілюстрацыі ў артбуках да камп'ютарных гульняў можна параўнаць з ілюстрацыямі да апавяданняў, але яны маюць сваю стылістычную спецыфіку: як правіла, яны драматычныя, кантрасныя і дынамічныя, ім уласцівы нейкі пафас. Ілюстрацыя часцяком створана з выкарыстаннем кінематаграфічных ракурсаў.

Практычна ўсе ілюстрацыі артбукаў, прысвечаных камп'ютарным гульням, адносяцца да лічбавага жывапісу і малююцца на графічных планшэтах. Выкарыстоўваюцца пры гэтым розныя тэхнікі: імітацыя традыцыйнага жывапісу з ярка выяўленымі мазкамі электроннага пэндзля, гіперрэалізм, калаж. Паколькі адна з галоўных задач ілюстрацый артбука — перадача візуальнага напаўнення гульнявога свету, вялікі ўпор у іх робіцца на перадачу фактуры матэрыялаў, з якіх павінны быць створаны гульнявыя аб'екты. Для стварэння рэалістычнага эфекту фактурных матэрыялаў і паверхняў выкарыстоўваюцца розныя штампы і пэндзлі, узмацняецца маляўнічасць і рэалістычнасць малюнка.

Вялікае значэнне ў ілюстрацыі гульнявога артбука мае каларыт. Як правіла, увесь артбук выконваецца ў адзіным каларыце, які ў лепшай ступені паказвае каларыт і настрой гульні. Для ілюстрацый выкарыстоўваюцца пэўныя каляровыя схемы, якія павінны ствараць той ці іншы настрой і выклікаць у чалавека якія-небудзь эмоцыі і пэўны псіхалагічны водгук — жах, страх, небяспека альбо, наадварот, радасць, шчасце, прымірэнне. Паколькі колер стварае фокусныя кропкі ўвагі, то дапамагае пазбегнуць залішняй перанасычанасці і стракатасці малюнка, стварае ілюзію глыбіні і дапамагае надаць намаляваным аб'ектам рэалістычны аб'ём. Часта выкарыстоўваецца мастакамі манахромны каларыт з яркімі каляровымі плямамі, што разбівае асноўны тон і канцэнтруе на сабе ўвагу.



Нельга не адзначыць таксама старанна прадуманае выкарыстанне кантрасту. Персанажы на ілюстрацыі павінны мець выразныя сілуэты, якія ўспрымаюцца з першага погляду, перадаюць кірунак героя, дынаміку яго паставы. Яркія персанажы могуць валодаць уласнай характэрнай паставай, што паказвае розныя характарыстыкі: хуткасць, сілу, яркія рысы характару. Актыўна выкарыстоўваецца градыент ад светлага да цёмнага ў мэтах узмацнення эфекту аб'ёмнасці і рэалістычнасці. Звычайна верхняя частка аб'екта вымалёўваецца больш светлай, чым ніжняя, гэта дапамагае сканцэнтраваць увагу на найбольш важных элементах выявы. Ствараюцца кантрасныя блокі, якія вылучаюць постаць па тоне і колеры. Розныя элементы часткі фігуры таксама могуць кантраставаць паміж сабой.

Для ўзмацнення эфекту драматычнасці і падтрымання атмасферы мастакі выкарыстоўваюць розныя выразныя крыніцы асвятлення. Заход сонца, прамень святла, які прабіваецца скрозь акно ў цемру пакоя, рэзкае святло каляровых неонавых лямпаў або мяккае святло ад экранаў камп'ютарнай тэхнікі.

У ілюстрацыях могуць таксама выкарыстоўвацца розныя пункты прагляду. Завышаны пункт прагляду часта выкарыстоўваецца для паказу вялікай колькасці прасторы, напрыклад, пакоя; заніжаны пункт прагляду дапамагае мастаку паказаць розныя дэталі на вялікай вышыні, напрыклад, складаныя прылады столі. Глыбіня ствараецца з дапамогай высвятлення далёкага плана, ужываннем святлопаветранай перспектывы. Паколькі камп'ютарная гульня валодае якасцямі, падобнымі да кінастужак, для перадачы напружаных, дынамічных і вострых сцэн выкарыстоўваюцца «кінематаграфічныя» выразныя ракурсы, выявы па кампазіцыі нагадваюць стоп-кадры падчас руху.

Стылістычныя асаблівасці ілюстрацый артбука, прысвечанага камп'ютарнай гульні, залежаць у першую чаргу ад стылістычнай накіраванасці самой гульні, яе жанру. Так, можна вылучыць некалькі асноўных стылістычных тыпаў гульняў і, адпаведна, ілюстрацый: фэнтэзі, навуковая фантастыка, гістарычны стыль.

Ілюстрацыі артбукаў, прысвечаныя розным жанрам гульняў, маюць характэрныя асаблівасці. Так, ілюстрацыі, выкананыя ў стылістыцы фэнтэзі, заклікаюць паказаць асаблівасці выдуманага свету, адрозненні розных рас і фантастычных істот. Выявы да артбука могуць нагадваць ілюстрацыі да кнігі казак альбо стоп-кадры з фантастычных фільмаў. Стыль ілюстрацый — сінтэз розных гістарычных стыляў мінулых эпох, часта выкарыстоўваюцца перапрацаваныя міфалагічныя вобразы. Сюжэт гульняў у стылістыцы фэнтэзі часцей за ўсё разгортваюцца ў выдуманым свеце, шмат у чым падобны да альтэрнатыўнага Сярэднявечча, дзе чалавек суіснуе з магіяй, багамі і разнастайнымі звышнатуральнымі істотамі, вобразы якіх часцей за ўсё бяруцца з міфалогіі і фальклору.

Як прыклад можна прывесці артбук да гульні «*Dragon Age: Inquisition*». У намаляванай архітэктуры і касцюмах персанажаў праглядаецца выразны ўплыў готыкі, мадэрну, мезаамерыканскага мастацтва, мастацтва эпохі Адраджэння і ранняга барока. Храмы аздоблены яркімі каляровымі вітражамі з сюжэтамі з выдуманай гульнявой рэлігіі па тыпе вітражоў з гатычных храмаў, што рэальна існуюць. Інтэр'еры эльфійскіх будынкаў упрыгожаны мудрагелістым пераплеценым дэкорам з раслінными матывамі з выкарыстаннем прыродных кветак. Многія будынкі ўпрыгожаны залатымі скульптурамі. Касцюмы мясцовай шляхты адной з дзяржаў нагадваюць касцюмы эпохі Адраджэння: мужчыны носяць панчохі і шарападобныя панталоны, гафрыраваны карункавы каўнер, жанчыны — сукенкі са спадніцай канічнай формы, што дзеляць постаць на два трыкутнікі.

Некаторыя касцюмы маюць дэкор, стылізаваны пад розныя прыродныя формы, напрыклад, маска ў выглядзе крылаў матылька. Сустракаюцца галаўныя ўборы тыпу «рагаты каптур», якія былі распаўсюджаны ў Сярэднявеччы. Мастацтва старажытнай невяковай мезаамерыкі нагадваюць розныя каменныя будынкі: закінутыя ў лясах піраміды, руіны, каменныя брамы. Ілюстрацыі, выкананыя ў стылістыцы навуковай фантастыкі, перш за ўсё павінны паказваць тую ці іншую ідэю, прадстаўляць канцэпцыю магчымай будучыні, новых тэхналогій і метады іх работы. Для іх характэрная вялікая дэталізацыя, рэалістычнасць і выкарыстанне ў ілюстрацыях крыніц штучнага рэзкага асвятлення.

У ілюстрацыях выкарыстоўваюцца элементы гістарычных стыляў, можа часткова капіравацца рэальнасць. Гульні ў жанры навуковай фантастыкі грунтуюцца на фантастычных дапушчэннях у галіне навукі: вынаходства выдуманых тэхналогій, навуковыя адкрыцці, кантакты з нечалавечым розумам, магчымая будучыня або альтэрнатыўны ход гісторыі, катастрофа, якая паглынула свет, і ўплыў гэтых дапушчэнняў на чалавечае грамадства. Сюжэт гульняў жанру навуковай фантастыкі часта разгортваецца ў будучыні. Прыкладам тут можа паслужыць артбук да гульні «*Stellaris*».

У ілюстрацыях вялікая ўвага ўдзяляецца шматлікім гульнявым расам, фантастычным іншапланетным краявідам з разнастайнымі кліматычнымі ўмовамі, шматлікім відам зброі і караблёў. Пейзаж кожнай планеты мае свой ландшафт і асноўны колер у залежнасці ад яе атмасферных і кліматычных асаблівасцяў. Вялікая ўвага — малюнку фактуры розных матэрыялаў: ашалёўка касмічных караблёў, паверхня скуры іншапланетных рас.

Ілюстрацыі да гістарычных гульняў імітуюць тыя ці іншыя з'явы з рэальнасці, характэрныя для той эпохі, у якой адбываецца развіццё гульнявога сюжэта, і цалкам капіруюць яе стылістыку. Спецыфіка гульняў з гістарычнай тэматыкай — яны грунтуюцца на прыкладзе рэальнага свету, але могуць несці некаторыя змененыя элементы. Напрыклад, альтэрнатыўнае развіццё гістарычных падзей, развіццё сюжэта ў выдуманым горадзе, які мае прататып у рэальнасці, увядзенне выдуманага персанажа ў рэальныя падзеі. Для такіх гульняў робяць дасканальную рэканструкцыю эпохі, у якой адбываецца дзеянне гульні, уключаючы мадэляванне палітычнай сістэмы, прадметаў ужытку, зброі і адзення ды іншых характэрных асаблівасцяў.

Прыкладам артбука да гульні ў гістарычнай стылістыцы можа паслужыць артбук «*Mafia*». Ілюстрацыі ў стылістыцы нуара адпавядаюць эпосе, у якой разгортваюцца падзеі гульні. Каларыт артбука прыглушаны, стрыманы, большая частка ілюстрацый выканана ў чорна-белых тонах, а ў каляровых ілюстрацыях наўмысна зніжана яркасць, нібы яны штучна састарэлыя. Большасць малюнкаў прыцемненыя па тоне, а дзеянні адбываюцца ноччу, часта ў дрэннае надвор'е. Усюды пануе змрочная атмасфера крымінальнай Амерыкі, персанажы на «фотаздымках» быццам злоўлены ў кадр выпадкова, злёгку размытыя. Героі паказаны ў характэрных для стылю барах, гульнявых установах, аўтамабілях, цёмных завулках, невыразнае асвятленне кантрасна вылучае контуры асоб.

Артбук — дастаткова цікавая з'ява ў свеце мастацтва, якое набірае папулярнасць. На жаль, беларускія мастакі яшчэ не спрабавалі сябе ў стварэнні артбукаў. Хочацца думаць, што ў нас гэта наперадзе.

Юлія ПЕШЫНА

Кіно

РОЗНАБАКОВАСЦЬ МЕСЯЦА

Кінафестываль «Лістапад» прадставіў сёлетнюю праграму

Пакрысе Беларусь упісваецца ў міжнародны кінематаграфічны кантэкст. Бягучы год таму доказ: упершыню за доўгі час айчынную стужку пакажуць у міжнароднай праграме; наша краіна стала сябрам міжнароднай федэрацыі кінапрэсы *FIPRESCI*; праграма індустрыяльнай платформы кінафестывалю «Лістапад» накіраваная на прадстаўленне нацыянальнага кіно за мяжой. Але што вартага паглядзець на «Лістападзе»? Адказваем: усё!

НАВІНЫ З ІНШАГА СВЕТУ

Звычайна ў абойму «Лістапада» трапляюць самыя вартыя. Праграмны дырэктар праграм іграваога кіно Ігар Сукманаў адзначае, што і сёлета ўсе стужкі прайшлі праз сіта: з 500 карцін выбралі 13, і кожная з іх ужо праявіла сябе ў замежным фестывальным жыцці (яны ўвайшлі ў лонгліст прэміі «Оскар»): «Не будзе прахадных фільмаў! Мы пакажам стужкі, якія атрымалі галоўныя ўзнагароды Канскага і Берлінскага кінафестываляў, і, безумоўна, запросім гледачоў на сустрэчы з яркімі кінематаграфістамі, бо нашы зоркі — гэта аўтары, тыя рэжысёры, якія дэкларуюць ісціну, любоў і прыгажосць, вакол чаго і сабралася сёлетняя калекцыя».

Кадр з фільма «Пакорлівая» (рэж. С. Лазніца).

Здавалася б, белых плямаў на фестывальнай карце не было, але нас чакае адкрыццё: сёлета на «Лістападзе» дэбютуе Албанія. У астатнім традыцыйны акцэнт асноўнага конкурсу — на краінах посткамуністычнай прасторы з лацінаамерыканскага, азіяцкага і еўрапейскага рэгіёнаў, якія былі блізкія нам гістарычным мінулым ці развіваліся ў тым жа кантэксце.

Напрыклад, карціна «Вестэрн», якой захапілася сама Марэн Адэ, рэжысёр трыумфальнага «Тоні Эрдмана», распавядае пра тое, як можа замежнік інтэгравацца ў наша посткамуністычнае асяроддзе. Увагу варта звярнуць на пераможцу фестывалю ў Карлавых Варах — стужку «Маленькі крыжаносец», якая прагучала ў вузкіх кінаколах, але выслізнула з поля зроку масавага гледача. Напэўна, адным з самых чаканых падарункаў айчыннай аўдыторыі стане «Пакорлівая» Сяргея Лазніцы, які калісьці ўшанаваў Васіля Быкава ў фільме «У тумане», а летась прадставіў на «Лістападзе» неадназначны «Аўстэрліц».

Арганізатары падкрэсліваюць, што на адкрыццё і закрыццё фестывалю штогод выбіралі гучныя стужкі Ханэке, Вайды і іншых майстраў кінематографа, але сёлета вырашылі зрабіць выключэнне: «Лістапад» закрые сербскі фільм «Восеньскі самурай» — першая ў гісторыі краіны карціна жанру баявых мастацваў для тых, хто настальгіруе па 90-х, Шварцэнэгеру ды Джэкі Чану. Ігар Сукманаў падсумоўвае, што ў асноўнай іграваой праграме аб'яднаныя незлучальныя глыбокія аўтарскія інтэнцыі з масавымі стужкамі, таму разам з сур'ёзным кіно будзе і такое, дзе давядзецца ўсміхацца і выціраць слёзы.

Па традыцыі ў праграме «Маладосць на маршы» прагучаць новыя кінематаграфічныя галасы: сярод іх і аўтары, якія ўжо паспелі стаць гонарам сваёй нацыі. Напрыклад, у 2010 годзе на «Лістападзе» сваю стужку ўпершыню прадставіў малады рэжысёр з Аўстраліі, які сёлета атрымаў спецыяльны прыз на Венецыянскім кінафестывалі за фільм «Слаўная краіна». Сёння некаторыя імёны могуць для нас не значыць нічога, тым не менш ужо заўтра яны могуць стаць уладальнікамі «Залатой пальмавай галіны». Таму абавязкова трэба звярнуць увагу на карціну «Цесната» з Расіі, якая стала адной з падзей сёлетняга Канскага кінафестывалю, стужку «Чамбра», падтрыманую фондам Марціна Скарсэзэ. Адна з самых арыгінальных работ — «Жахлівая маці» з Грузіі (гэтае кіно краіна адпраўляе на саісканне «Оскара»). І самая прыемная навіна: упершыню з 2010 года ў «Маладосці на маршы» дэбютуе кіно ад беларускага аўтара: карціна «Заўтра» Юліі Шатун упісвае нашу краіну ў шэраг якаснага маладога еўрапейскага кіно.

АД МАЛЕНЬКАГА ДА ВЯЛІКАГА

Працягвае змагацца са стэрэатыпамі дзіцячы конкурс «Лістападзік». На жаль, меркаванне аб тым, што такое кіно — толькі для дзяцей, моцна зацвярдзілася сярод гледачоў. Пры тым, што жанр сямейнага кіно — адзін з самых запатрабаваных і папулярных у кінатэатрах па ўсім свеце. Тым больш што на «Лістападзіку» пакажуць не проста забаўляльныя гісторыі, а сур'ёзнае жанравае кіно для тых, хто хоча парэфлексаваць. Арганізатары выбралі кіно, якое сур'ёзна размаўляе з маладымі гледачамі, прапаноўвае ім ісці ў дарослае жыццё зняўшы руковыя акуляры.

Пачнуцца конкурсныя паказы карцінай з Ірана «Подых жыцця». Гэтае кіно краіна сёлета адпраўляе на «Оскар». Іран — вядомы знаўца трэндаў у кінематографе: летась менавіта іранская стужка «Камівяжор» атрымала каштоўную статуэтку. Яшчэ адным цікавым кандыдатам для прагляду стане «Канец лета» — кітайскае кіно пра тое, як футбольная ліхаманка можа стаць нагодай змяніць жыццё (сусветная прэм'ера адбылася ў кастрычніку на самым важным кінафестывалі Азіяцкага рэгіёна ў Пусане).

Фільм-адкрыццё «Лістападзіка» — таксама не выпадковае кіно. Гэта нямецкая работа «Цім Талер, або Праданы смех», асабліва цікавая для Беларусі: у 1981 годзе на «Беларусьфільме» Леанід Нячаеў зняў аднайменную стужку, якая стала культавай з'явай беларускага кінематографа. Закрые фестываль стужка «Вэндзі» — кіно, якое дазволіць расслабіцца, але разам з тым не забыцца, што свет дзяцінства — гэта праблемы, з якімі не заўсёды дзіця можа справіцца сам-насам.

АСОБЫ І АСАБЛІВАСЦІ

У праграме дакументальнага кіно ёсць змены: у конкурсе нацыянальных кінашкол сёлета возьмуць удзел ажно 13 устаноў! Маладую дакументалістыку прадставяць школа Марыны Разбежкінай, некалькі ўкраінскіх кінашкол, ізраільскі каледж Сапір, БДАМ і іншыя. Што тычыцца асноўнага конкурсу дакументальнага кіно, то тут «прагучаць» 12 стужак. Прыграмны дырэктар Ірына Дзям'янава адзначае, што фільмы, якія чакаюць гледача, вельмі розныя: «Мы спрабавалі пашырыць палітру, таму да асноўнага фокусу дадалі фільмы, якія распавядаюць вельмі далёкія гісторыі. Гэта стужкі пра авантурыстаў XX стагоддзя, зроблены вельмі вытанчана».

Аматараў дакументалістыкі чакаюць некалькі дэбютаў. Напрыклад, свежая работа Вольгі Дашук «Сяргей Плыткевіч. Чалавек з фотаапаратам» і «Апошні вальс» — расійскае кіно пра апошнія месяцы жыцця вялікага кампазітара Алега Каравайчука (прэм'ера фільма адбылася на Маскоўскім кінафестывалі), а таксама дзве цікавыя пазаконкурсныя стужкі «Танга ў Парыжы» пра Астэра П'яцолу і «Маэстра Анісімаў» пра знакамітага беларускага дырыжора. Абавязкова варта наведаць паказ стужкі «Жанчына з фатаграфіі» — кіно, якое распавядае пра адзін з самых яркіх эпізодаў эстонскай гісторыі ў перыяд першай буржуазнай рэспублікі праз жыццё фотаатэлье, здымкі старога Таліна і яго людзей. Неверагодным досведам можа стаць прагляд карціны «Брат Якаб»: вельмі тонкая, інтымная стужка пра маладога чалавека, які прачытаў Каран і вырашыў прыняць іслам. Асабліва актуальны гэты фільм цяпер, бо ламае ўяўленне еўрапейцаў пра тое, што такое гэтая рэлігія ў сусветным кантэксце.

На «Лістападзе» прадставяць «Нармальны аўтысцкі фільм» — пра дзяцей, якіх мы называем іншымі, і пра тое, які складаны і тонкі іх унутраны свет, з якой асцярожнасцю трэба ставіцца да іх. Яшчэ больш цікава будзе глядзець гэты фільм, калі параўнаць яго з падобнай па тэме стужкай «Антон тут побач» Любові Аркус, а пасля схадзіць на паказ новага дакументальнага фільма Галіны Адамовіч на гэтую ж тэму. Разынкай дакументальнай праграмы стане незвычайная «Гісторыя сямейнага жыцця»: дзесяцігоддзямі рэжысёр назірала за героямі, сябравала і нават удзельнічала ў іх жыцці. Гэты досвед будзе цікавы кожнаму з нас, бо галоўнае ў гэтай гісторыі — узаемаадносіны блізкіх людзей, часам вельмі складаныя, але такія ж зразумелыя.

ПЛЯЦОЎКІ ДЛЯ ЎСІХ

Нацыянальны конкурс праводзіцца на фестывалі чацвёрты раз (дэталёва аб праграме чытайце ў наступным нумары «ЛіМа»). Важна, каб маладыя кінематаграфісты былі гатовыя да «выхаду ў свет»: умелі размаўляць з партнёрамі, прадстаўляць свае праекты і ўяўлялі, як можа развівацца працэс вытворчасці фільма і колькі часу давядзецца на гэта выдаткоўваць. Менавіта таму на індустрыяльнай пляцоўцы асноўным мэсэджам стане дапамога кінематаграфістам. З лекцыямі выступяць прадстаўнік краўдфандынгавай платформы *Ulej.by* Ганна Самарская, актрыса Алеся Грыбок распавядзе пра менеджмент кінаакцёра. Запланаваны майстар-клас па вытворчасці трэйлераў. Другі год запар пройдзе і дзень віртуальнай рэальнасці: пакажуць 16 сферычных стужак з некалькіх краін, у тым ліку і Беларусі, таксама ў якасці падарунка будзе фільм «Эрмітаж» з Канстанцінам Хабенскім.

Што тычыцца арганізацыі фестывалю, то тут чакае шмат змен: па-першае, новыя пляцоўкі (айчыннае кіно будуць паказваць у «Беларусі», некаторыя паказы пройдуць у *Falcon Club*); па-другое, з'явіліся абанементы: можна набыць квіткі адразу на ўсю праграму фестывалю, дарэчы, цэны засталіся такія ж прыемныя; па-трэцяе, пераможцаў чакаюць новыя ўзнагароды. «Бронза "Лістапада"» застаецца прызам глядацкіх сімпатый, а «срэбра» ўвасобяць «Новыя галасы» (прыз *FIPRESCI* за лепшы дэбют). Але вартасць «Золата "Лістапада"» неаспрэчная: Гран-пры атрымае лепшая фестывальная стужка.

Маргарыта ДЗЯХЦЯР

Музыка

КАНЦЭРТЫ ЖОЎТАГА ЛІСЦЯ

Калі восенню холадна не толькі фізічна, але і душэўна, то сагрэць можа добрая музыка. Беларуская восень багатая на музычныя падзеі, таму выбраць ёсць з чаго: прывабная экзотыка, нечаканая класіка і беларускія матывы.

1. Вялікая зала Белдзяржфілармоніі працягвае новы сезон незвычайнай падзеяй: 5 лістапада можна пачуць канцэртнае выкананне оперы «Атэла». Цягам апошніх 15 гадоў на філарманічнай сцэне оперы ўжо гучалі, але гэта ўсё яшчэ незвычайны і доўгачаканы досвед, які сёлета аднаўляецца пасля пяцігадовага перапынку. Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь прадставіць оперу Вердзі, а прысвечанае выступленне будзе юбілею Аляксандра Анісімава. Бягучы год аб'яўлены Годам італьянскай культуры ў Беларусі, таму асабліва прыемна, што над «Атэла» працаваў італьянскі рэжысёр Карла Антоніа дэ Лючыя, які распрацаваў сцэнічную партытуру. Як і ў іншых оперных пастаноўках аркестра, у «Атэла» на сцэну філармоніі выйдзе зорны склад салістаў з розных краін: П'еро Гульячы — Атэла (Італія), Ірына Крыкунова — Дездэмона (Расія), Дэменіка Бальцані — Яга (Італія), Іван Міхайлаў — Касіа (Расія), таксама беларускія спевакі і Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Г. Шырмы.

2. Гурт «*Harotnica*» з самага пачатку існавання называе сябе «дэструктыўным пажарным аркестрам». Калі менавіта такога аркестра, а не сімфанічнага, хочацца восеньскім вечарам, то 29 кастрычніка *TNT Rock Club* запрашае на бясплатны канцэрт калектыву. У 2007 годзе гурт заснаваў мастак і паэт Андрусь Такінданг, які распрацаваў і канцэпцыю: лірыка пра складаны жаночы лёс павінна рваць душу слухача. З часам акустычны бэнд разросся ў групу з 8 чалавек, а ў аднаскладную канцэпцыю ўпляліся элементы ска, класікі, рэгі, джаза, фанку ды іншых жанраў. Калектыў адрозніваецца незвычайны інструментальны склад (яркая група духавых, выкарыстанне домры), нестандартныя формы песень, доўгія імправізацыі і паводзіны на сцэне. На канцэрце гурт выступіць з новым электронна-акустычным праектам «*Harotnica mix*».

3. Экзатычны канцэрт-трыб'ют «Легенда блюза Джон Лі Хукер & *Cross B Band*» адбудзецца 29 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі. Арганізатары адзначаюць, што гэта падарунак не толькі для знаўцаў і прыхільнікаў блюза і джаза ў Беларусі, але для тых, хто толькі пачынае адкрываць для сябе магію гэтай музыкі. У сталіцу завітае Джон Лі Хукер — амерыканскі блюзавы спявак і гітарыст, які зрабіў унёсак у развіццё поп-музыкі другой паловы XX стагоддзя. Нягледзячы на тое, што Хукер пачаў выступаць даўно, сусветная вядомасць і нават мода на гэтага выканаўцу прыйшла ўсяго некалькі гадоў таму. Дзве апошнія кружэлкі музыканта замацавалі за ім славу лепшага блюзавага выканаўцы свету. Цяпер перавыдаюцца і больш раннія запісы музыканта, а яго сябры-артысты адзначаюць, што «нам пашанцавала жыць у адзін час з ім». Неаднойчы Хукер станавіўся лаўрэатам прэміі «Грэмі», таму можна з дакладнасцю зазначыць, што блюз у яго выкананні — гэта тое, пра што кажуць: «Не музыка, а магічная сіла і стан душы».

РаўнаВажнасць

Палёт над побытам і паглыбленне ў традыцыю — у творчасці студэнтаў і выкладчыкаў

Разнастайнасць, глыбіня, чараўніцтва… Менавіта так можна ахарактарызаваць выстаўку «З творчасцю па жыцці» кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якая зараз працуе ў Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». У праекце прадстаўленыя творы выкладчыкаў, студэнтаў і выпускнікоў кафедры.



Марта Зіміна «Начное», 2017 г.

Экспануюцца работы як акадэмічнай, так і сучаснай школы. Жывапіс, графіка, кераміка, габелен — усё гэта з года ў год выкладчыкі спрабуюць захаваць і развіваць разам са студэнтамі. Дасведчаны глядач, які бывае на калектыўных выстаўках беларускіх аўтараў, заўважае: з'яўляюцца новыя імёны і цікавыя творы. Выстаўка «З творчасцю па жыцці» адкрыла цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных 15-годдзю галерэі «Універсітэт культуры». Яна паказвае, дзеля чаго існуе галерэя і наколькі важная ў сучасных умовах папулярызацыя беларускай культуры.

— Такой вялікай спецыяльнай выстаўкі даўно не было, — адзначыла дацэнт кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Тамара Васюк. — Падчас падрыхтоўкі і мы, і вучні спрабавалі назіраць адзін за адным. Вучні больш пільна прыглядаліся да таго, што могуць выкладчыкі. Калісьці нашы выкладчыкі прыйшлі ва ўніверсітэт з Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, дзе былі вельмі моцныя, шчырыя і магутныя настаўнікі. Яны навучылі нас так, што, мне здаецца, мы за жыццё не здолеем перадаць усю інфармацыю і ўменні, якімі валодаем. Нас Бог багата адарыў, таму трэба і самім добра падзяліцца з моладдзю па тых кірунках, якія прапануем. Ядвіга Дамінікаўна Грыгаровіч зрабіла нашу кафедру, зляпіла яе па кавалачках. Яе, на жаль, сёння больш няма. Але я заўсёды ўспамінаю, якія ў яе былі патрабаванні да выкладчыкаў і да студэнтаў: мы не маглі сабе дазволіць абыякава ставіцца да таго, што робім.

Сувязь творчасці студэнтаў і выкладчыкаў прасочваецца праз дэталі. Ёсць пераемнасць пластычнасці, формаўтварэння, колераў і тэхнікі. Аднак адрозніць работы старэйшага пакалення можна адразу: яны глыбока сканцэнтраваныя на ўшанаванні роднага.

— У мяне былі студэнты, якія не слухалі слова, а прачытвалі думкі, намеры. Гэта самы высокі ўзровень адносін паміж студэнтам і выкладчыкам. Толькі сказаў, а ўжо прачытана тая літаратура альбо ўзгаданы патрэбны вобраз. Так цікавей працаваць, — падкрэслівае Тамара Васюк. — Мне здаецца, што наша адукацыя каштоўная перадачай ведаў. Аднак мы мала ганарымся тым, што маем… Я была знаёмая з Уладзімірам Караткевічам і добра памятаю, як заўсёды ён казаў: «Які грэх — забыццё!». Студэнтаў мы спрабуем навучыць не толькі ствараць, але ж і адчуваць родную зямлю, любіць і шанаваць яе гісторыю, культуру, традыцыі.

Экспазіцыя размеркавана па ўсіх чатырох залах галерэі. У кожнай размешчаны творы асобнага кірунку. Гэта можна лічыць адмысловасцю вернісажу: арганізатары размясцілі разам экспанаты розных жанраў, каб успрыманне было больш прадуктыўным і цэласным.

Студэнты і выкладчыкі, якія належаць да розных пакаленняў, не заўсёды могуць прыйсці да кампрамісу і паразумення ў творчых пытаннях. Як сучасным маладым у наш рацыянальны час патлумачыць, што не ўсё вымяраецца матэрыяльнымі выгодамі і побытавым дабрабытам?

— На гэты конт размова са студэнтамі бывае больш складанай, чым, напрыклад, 20—25 гадоў таму. Узровень разумення змяняецца, — адзначае Тамара Васюк. — Вось што падказвае традыцыя: ёсць дзве беларускія пасудзінкі — спарышы. Калісьці гэты посуд быў функцыянальны, але сёння страціў прызначэнне і стаў сувенірам. Яго ідэя такая: у чалавеку, як на шалях, павінна суіснаваць матэрыяльнае і духоўнае. А цяпер адбываецца так, што частка, у якой павінна быць духоўнае, забіта матэрыяльным. Адбываецца перакос. Хто, як не мы, прадстаўнікі старэйшага пакалення, можам патлумачыць, што трэба імкнуцца да раўнавагі.

Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара

Касцюм з калекцыі кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКМ.

Уладзімір Валаско «Рыба 69», 2014 г.

Культурны ракурс

Дэкаратыўна-анімалістычная кампазіцыя «Пятачок» на плошчы Свабоды ў горадзе Лепелі, створаная паводле народных традыцый, заўсёды выклікае вялікую цікавасць у турыстаў. Аўтар помніка — вядомы беларускі скульптар Леў Аганаў, які і аўтар адзінага ў Беларусі помніка канцлеру Вялікага Княства Літоўскага Льву Сапегу, што сустракае ў Лепелі перад уваходам у гарадскі парк.

У скульптурнай кампазіцыі выкарыстана выява папулярнага героя народных паданняў і легенд Несцеркі — гаваруна, веселуна, працавітага і прадпрымальнага чалавека, які накіроўваецца на мясцовы кірмаш, каб прадаць змешчаныя ў зручнай і ёмістай торбе самабытныя гліняныя вырабы. Менавіта імі здаўна славіцца Лепельшчына. Нездарма ж адной з найбольш праўдападобных версій паходжання назвы нашага горада лічацца словы «лепка» і «ляпіць».

Дарэчы, знайшлося месца ў торбе і дарам лесу — грыбам, ягадам. Ва ўзнятай над галавою правай руцэ народны ўлюбёнец трымае добра вядомую павялічаную ў памерах пяцікапеечную манету (знакаміты «пятачок» 1805 года, калі Лепелю быў прысвоены статус горада). Злева, пад пахай, у Несцеркі задзірысты певень — старажытны сімвал раніцы, абуджэння ад сну, якога ў даўніх народных вераваннях лічылі яшчэ і ўвасабленнем духа злакаў, багатага ўраджаю.

Да ног Несцеркі лашчыцца авечка — сімвал лагоднасці, пакорлівасці і вясковага жыцця. Невыпадкова ў раннім хрысціянскім мастацтве апосталы адлюстраваны ў выглядзе дванаццаці ягнятак. І ў завяршэнне скульптурнай кампазіцыі побач з фальклорным героем аўтар помніка змясціў невялікае пацешнае парася, якое было ў нашых продкаў сімвалам урадлівасці і росквіту.

Мікалай ГАРБАЧОЎ

Да ўвагі чытачоў! «ЛіМ» працягвае конкурс «Культурны ракурс». Умовы творчага спаборніцтва змешчаны ў № 2 нашай газеты. Чакаем цікавых і крэатыўных фотаздымкаў з арыгінальным тлумачэннем.

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года

16 +

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Ларыса Іванаўна ЦІМОШЫК

Рэдакцыйная калегія:
Тацяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 292-20-51
намеснік галоўнага рэдактара — 292-43-03
адказны сакратар — 292-20-51
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 292-56-53
аддзел прозы і паэзіі — 292-56-53
аддзел мастацтва — 292-20-51
аддзел «Кніжны свет» — 292-56-53
бухгалтэрыя — 287-18-14
Тэл./факс — 292-20-51

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Тэхнічны рэдактар, камп'ютарная вёрстка:
А. В. Бізункова

Камп'ютарны набор:
А. І. Грамыка

Стыльрэдактар:
Н. А. Святлова

Нумар падпісаны ў друк
26.10.2017 у 11.00

Ум. друк. арк. 3,72

Наклад — 1532.

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 3759

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе, не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Аўтары паведамляюць прозвішча, імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, месца працы, адрас з індэксам. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.

© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2017
© ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», 2017
© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2017

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 17043